Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЖНІЎНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №162 (28526)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Раннія немаўляты



Асуджаныя за наркотыкі

СТАР. 4



Пяць пытанняў пра грашовыя пераводы

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Людміла РЭУЦКАЯ, начальнік упраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя:**

*«Цэны на айчынныя і замежныя лекавыя сродкі зніжаны па шэрагу пазіцый па выніках маніторынгу фармрынку. Пытанне забеспячэння цэнавай даступнасці лекавых сродкаў знаходзіцца на пастаянным кантролі ў Міністэрстве аховы здароўя. Работа, якая праводзіцца ў гэтым кірунку, дазволіла дабіцца ўстойлівага зніжэння цэн на лекі. Так, па інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, на працягу 2017 года назіраецца зніжэнне сярэдніх розничных цэн на лекавыя сродкі: індэкс спажывецкіх цэн за студзень—жнівень 2017 года да снежня 2016 года склаў 98,55%».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9319 | ▲ |
| Еўра | 2,2733 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0755 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

17162

# Лазневы дзень



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вёска Даўгінава, Вілейскі раён.

■ Тэхналогіі поспеху

## Хуткія, экалагічныя, свае

### Беларускія навукоўцы прэзентавалі распрацоўкі ў сферы электратранспарту

**Максімальная хуткасць — 110 кіламетраў за гадзіну, разгон да «сотні» — за дзевяць з паловай секундаў, магутнасць — 80 конскіх сіл. Магчыма, не самыя выдатныя паказчыкі для звычайнага сучаснага аўтамабіля, але ключавое слова тут «звычайнага». Размова ідзе пра распрацаваны ў Аб'яднаным інстытуце машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук першы беларускі электрамабіль, эксперыментальны экзэмпляр якога днямі паказалі кіраўніцтву краіны і журналістам. Машына створана на базе серыйнага Geely SC7 беларускай зборкі (сімвалічны момант — асновай для распрацоўкі паслужыла самая першая «легкавушка», якая сышла з канвеера прадпрыемства «БелДжы»). Уся кампанентная база цягавага электрапрывода створана ў нашай краіне.**

СТАР. 3



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Супрацоўнікі Інстытута машынабудавання расказваюць пра сваю распрацоўку намесніку прэм'ер-міністра Уладзіміру СЯМАШКУ.

■ Горадабудаўніцтва

## ПЕРАПРАФІЛЯВАНЫЯ ЗАВОДЫ І НОВЫЯ КВАРТАЛЫ

### Як будзе развівацца Мінск

**Напярэдадні 950-годдзя сталіцы старшыня камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама Павел ЛУЧЫНОВІЧ расказаў пра тое, якія буйныя праекты будуць рэалізаваныя ў найбліжэйшы час, што чакае прыватны сектар і якім чынам кожнаму можна будзе паўплываць на паляпшэнне свайго горада.**

### Горад для прыгожай працы

Кірункі забудовы сталіцы заклаў прыняты ў мінулым годзе генеральны план. Аднак цяпер распрацоўваюцца яшчэ два маштабныя дакументы: правілы забудовы і правілы сядзібнай забудовы, якія будуць арыентаваныя менавіта на рэаліі жыцця ў сталіцы. Як растлумачыў Павел Лучыновіч, будуць аналізавацца агульнарэспубліканскія нормы і мяняцца тыя, якія не падыходзяць для Мінска як для горада з асаблівым статусам для Беларусі. Напрыклад, павялічыцца колькасць машына-месцаў, пераўтворыцца аблічча дваравой тэрыторыі, у адрозненне ад іншых гарадоў ужо ёсць абмежаванні па максімальнай шчыльнасці забудовы.

Апошнія некалькі гадоў асабліва часта ўздымалася тэма зносу прыватнага сектара. Многія дамы дзясяткі гадоў знаходзіліся «пад умоўным зносам», гэта значыць лёс іх канчаткова не быў вызначаны, але некаторыя тыпы рамонтных работ выконваць усё роўна забаранялася. Галоўны архітэктар Мінска запэўніў, што больш такога не будзе, рашэнні будуць прымацца аператыўна і людзі змогуць давесці да ладу сваё жыллё.

Пры гэтым зменены нормы і па аб'ёмах зносу. Калі раней ліквідавалася 70% нізкапавярховай забудовы і толькі 30% захоўвалася, то цяпер гэтыя лічбы памяняліся месцамі. Тым не менш нязгодных і зараз дастаткова. Каб выслухаць меркаванне мясцовых жыхароў, праводзяцца грамадскія абмеркаванні, на якіх прэзентуюць дэталёвыя планы, за апошні час іх колькасць вырасла ў разы. Праўда Павел Лучыновіч прызнаў, што грамадскае абмеркаванне, умоўна кажучы, у актавай зале школы — гэта не самы зручны фармат. Таму ў планах — пераняць досвед Расіі, Украіны і Польшчы і ў якасці пляцоўкі выкарыстоўваць у тым ліку і інтэрнэт.

СТАР. 2

# ПЕДСАВЕТ ВЫСОКАГА ЎЗРОЎНЮ

**Сёння Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у Рэспубліканскім педагагічным савеце.**

Мерапрыемства пройдзе ў максімальна адкрытым і дыскусійным ключы, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. На яго запрошаныя больш за 800 чалавек, у ліку якіх не толькі вышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі органаў дзяржкіравання, мясцовай вертыкалі ўлады, дэпутаты, але, перш за ўсё, работнікі ўстаноў адукацыі з усіх абласцей краіны і горада Мінска. У фармаце адкрытага мікрафона яны змогуць падзяліцца сваімі думкамі і вопытам па тых ці іншых пытаннях.

На пленарным пасяджэнні Рэспубліканскага педсавета плануецца падрабязна абмеркаваць трансфармацыі і тэндэнцыі адукацыйных працэсаў, шляхі іх адаптацыі да патрабаванняў часу і з улікам передавога нацыянальнага і замежнага вопыту. Будзе дадзена ацэнка вынікам развіцця ў Беларусі ўсіх звёнаў сістэмы адукацыі, намечаны перспектывы іх удасканалення. У цэнтры ўвагі таксама роля педагога, прынцыпы і падыходы да выхавання падрастаючага пакалення.

Для ўдзельнікаў рэспубліканскага педагагічнага савета арганізавана выстава творчых дасягненняў педагогаў, вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры, новых тэхналогій у адукацыі. Адна з навінак — так званы разумны школьны аўтобус, які з дапамогай спецыяльнага праграмна-апаратнага комплексу дазваляе дадаткова забяспечыць бяспеку навучэнцаў.

Тэлеверсія пленарнага пасяджэння Рэспубліканскага педсавета з удзелам Прэзідэнта будзе паказана сёння ў эфіры тэлеканалаў «Беларусь 1» і «Беларусь 24» у 21:30.

■ У цэнтры ўвагі

# ПЕДАГОГІ ПАСТАВЯЦЬ КРОПКІ НАД «І»

## Рэспубліканскі педагагічны савет распачаў ўчора сваю работу ў Мінску

**У першы дзень быў арганізаваны шэраг тэматычных секцый і круглых сталоў. Спецыялісты абмеркавалі сучасныя падыходы да павышэння якасці дашкольнай адукацыі, уклад прафесійнай адукацыі ў інавацыйнае развіццё беларускай эканомікі, асноўныя напрамкі развіцця вышэйшай школы. Акрамя таго, у цэнтры ўвагі спецыялістаў аказаліся актуальныя аспекты сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы, развіццё інклюзіўнай адукацыі, падрыхтоўка педагагічных кадраў, прафілізацыя навучання і прафарыентацыя навучэнцаў, лічбавая трансфармацыя адукацыі і функцыянаванне «разумнай» школы.**

Рэспубліканскі педсавет працягне сваю работу сёння на пленарным пасяджэнні з удзелам кіраўніка дзяржавы. Яго ўдзельнікі змогуць азнаёміцца з выставай эфектыўнага педагагічнага вопыту, творчых дасягненняў педагогаў, вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры, узораў новых тэхналогій у сферы адукацыі. У педсавеце бяруць удзел каля тысячы педагогаў, кіраўнікоў устаноў адукацыі, рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання, а таксама прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў і галіновага прафсаюза.

Мэта форуму — вызначыць задачы на 2017/2018 навучальны год, абмеркаваць канцэптуальныя падыходы да развіцця сістэмы адукацыі на кароткатэрміновы і доўгатэрміновы перыяды. Галоўны пасыл — у пераходзе да абавязковай усеагульнай сярэдняй адукацыі. Такі крок, як адзначаюць у Міністэрстве адукацыі, выступіць гарантам паспяховай сацыялізацыі беларускай моладзі. Агульную сярэднюю адукацыю ў Беларусі атрымліваюць практычна ўсе выпускнікі ліцэяў і каледжаў. У прафтэхустановах менш як на 10 працэнтах спецыяльнасцяў навучэнцам даюць толькі рабочую прафесію без атрымання агульнай сярэдняй адукацыі. Раней пасля базавай школы такіх спецыяльнасцяў было больш, але ў апошнія гады запатрабаванасць падобных праграм няўхільна зніжалася.

Таму да пераходу да абавязковай сярэдняй адукацыі грамадскасць гатова, упэўнены ў галоўным адукацыйным ведамстве. А ў Кодэксе аб адукацыі закладзены заканадаўчы калідор для гэтай навацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■

# Нацбанк зніжае стаўку рэфінансавання да 11,5% гадавых

**Праўленне Нацыянальнага банка Беларусі прыняло рашэнне аб зніжэнні з 13 верасня стаўкі рэфінансавання з 12% да 11,5% гадавых, паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка.**

Стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях падтрымкі ліквіднасці банкаў знізяцца з 14% да 13% гадавых.

Фактычная інфляцыя працягвае змяншацца. У жніўні 2017 года ў гадавым вымярэнні прырост спажывецкіх цэн ацэньваецца на ўзроўні крыху ніжэй за 6%, базавая інфляцыя — каля 5% у гадавым выражэнні.

Знаходжанне на працягу доўгага часу тэмпаў прыросту спажывецкіх цэн у вузкім дыяпазоне (6—6,5%) адлюстроўвае ўстойлівасць працэсаў запавольнення інфляцыі і досыць высокую верагоднасць яе захавання на гэтым узроўні ў наступныя месяцы. Тэмпы росту грашовай прапановы застаюцца ўмеранымі (прырост сярэдняй шырокай грашовай масы ў ліпені 2017 года ў гадавым вымярэнні склаў 7,8%) і адпавядаюць попыту эканомікі на грошы на фоне аднаўлення дзелавой актыўнасці (валавы ўнутраны прадукт за студзень—ліпень вырас на 1,1%).

У цэлым чакаецца, што па выніках 2017 года прырост спажывецкіх цэн не перавысіць 7%. Магчымасці далейшага паступальнага зніжэння працэнтных ставак у эканоміцы будуць вызначацца верагоднасцю і велічынёй рэалізацыі інфляцыйных рызык, якія стрымліваюць дасягненне сярэднетэрміновай мэты па інфляцыі (не больш за 5% у 2020 годзе).

Стаўка рэфінансавання зніжаецца ў Беларусі сёмы раз з пачатку года. Так, з 18 студзеня яна знізілася з 18% да 17% гадавых, з 15 лютага — да 16% гадавых, з 15 сакавіка — да 15% гадавых, з 19 красавіка — да 14% гадавых, з 14 чэрвеня — да 13% гадавых, з 19 ліпеня — да 12% гадавых.

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Польшча на $55 млрд павялічыць выдаткі на абарону

Улады Польшчы на працягу наступных 15 гадоў дадаткова вылучаць з бюджэту краіны $55 млрд на абарону. Пра гэта заявіў у апублікаваным у сераду інтэрв'ю агенцтву Reuters намеснік міністра абароны Польшчы Томаш Шаткоўскі.

«Урад адобрыў папраўкі да заканадаўства, яны даюць нам каля 200 млрд злотых (каля $55 млрд) на працягу наступных 15 гадоў», — сказаў ён.

Па дадзеных Reuters, выдзеленыя сродкі будуць выдаткаваныя на павелічэнне колькасці арміі амаль у два разы і яе мадэрнізацыю, так як дзве трэці баявой тэхнікі знаходзіцца на ўзбраенні яшчэ з часоў Варшаўскай дамовы.

Раней польскі ўрад прыняў рашэнне павялічыць расходы на абарону да 2,5% ВУП да 2030 года. Зараз Польшча траціць на абаронныя патрэбы каля 2,01% ВУП.

У планах міністэрства ёсць закупка знішчальнікаў пятага пакалення, аднак Шаткоўскі адзначыў, што гэта не адбудзецца раней 2025 года. Пры гэтым Мінабароны прыйдзецца расстаўляць прыярытэты: у прыватнасці, за кошт адмовы ад узмацнення паветрана-дэсантных войск будуць мадэрнізаваны інжынерныя і артылерыйскія войскі, таксама аб'ём сродкаў на мадэрнізацыю ВМС будзе адносна сціплым.

## Трамп сцвярджае, што ніводзін прэзідэнт ЗША не дабіўся гэтак шмат, як ён за паўгода

З такім сцвярджэннем сам Трамп выступіў учора перад сваімі прыхільнікамі ў Фініксе (штат Арызона).

«Я не веру, што які-небудзь прэзідэнт дабіўся так шмат чаго, колькі прэзідэнт за шэсць ці сем месяцаў», — сказаў Трамп. Пасля гэтага ён звярнуў увагу на тое, што яму ўдалося правесці праз Кангрэс кандыдатуру новага члена Вярхоўнага суда ЗША Ніла Горсача.

Характэрна, што большая частка прамовы Трампа, якая працягвалася больш за гадзіну, была прысвечана крытыцы ліберальных СМІ, дэмакратаў і іншых членаў Кангрэса, якія, у прыватнасці, пакуль не дазволілі яму адмяніць ключавыя палажэнні сістэмы медыцынскага страхавання Obamacare, што было яго першым перадвыбарным абяцаннем.

## Каментатара адхілілі ад асвятлення матча ў Шарлотсвіле з-за яго прозвішча



Дырэкцыя спартыўнага тэлеканала ESPN прыняла рашэнне адхіліць каментатара Роберта Лі ад асвятлення матча па амерыканскім футболе ў Шарлотсвіле.

Справа ў тым, што журналіст з'яўляецца поўным цёзкам камандзіра арміі канфедэратаў Роберта Эдварда Лі, з-за помніка якому 12 жніўня ў Вірджыніі разгарэліся масавыя беспарадкі.

Баючыся новых правакацый, тэлеканал вырашыў «не даваць лішняй нагоды» і прызначыць іншага каментатара на матч у штаце Вірджынія.

Нагадаем, што 12 жніўня ў Шарлотсвіле неанацысты правялі факельнае шэсце ў падтрымку захавання манумента генерала Роберта Эдвард Лі, які вырашылі знесці мясцовыя ўлады. Скончылася ўсё масавымі беспарадкамі, падчас якіх у натоўп дэманстрантаў уехаў аўтамабіль. У выніку адзін чалавек загінуў і 19 атрымалі раненні. Яшчэ 15 чалавек пацярпелі падчас сутычак на вуліцах горада.

## З удзячнасцю або скаргай

**Аблвыканкамы і Мінгарвыканкам у суботу, 26 жніўня, правядуць чарговыя прамыя тэлефонныя лініі. Задаць свае пытанні жыхары краіны змогуць з 9.00 да 12.00. На званкі адкажуць:**

кіраўнік спраў БРЭСЦКАГА аблвыканкама Юрый Іосіфавіч НАРКЕВІЧ, тэл. 8 (016) 2213121;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ, тэл. 8 (021) 2222222;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Алег Леанідавіч БАРЫСЕНКА, тэл. 8 (023) 2751237;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО, тэл. 8 (015) 2735644;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН, тэл. 8 (022) 2501869;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ, тэл. 8 (017) 5004160;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ, тэл. 8 (017) 2224444.

# ПЕРАПРАФІЛЯВАНЫЯ ЗАВОДЫ І НОВЫЯ КВАРТАЛЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мы ідзём на дыялог і чуем гараджан. Прыклад таму — Асмалоўка. Але мы не можам па ўсім горадзе захаваць нізкапавярховую забудову. Там, дзе ёсць такая магчымасць, мы гэта робім. Возьмем той жа Сельгаспасёлак, дзе істотна скараціліся аб'ёмы зносу. Але, напрыклад, праспект Дзяржынскага — буйная магістраль, тут захаваць прыватную забудову не ўяўляецца магчымым, — адзначыў старшыня камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама.

Некаторыя мінчане прапануюць не зносіць прыватны сектар, а замест гэтага ліквідаваць заводы, якія не працуюць. Аднак Павел Лучыновіч з такой ідэяй катэгарычна не згодны:

— Мы не можам зрабіць горад, прыдатны выключна для забаў. Тут велізарныя працоўныя рэсурсы, якія неабходна задзейнічаць, бо менавіта вытворчасці — аснова эканомікі. Я б хацеў, каб Мінск стаў горадам для прыгожай працы.



## У рэчышчы джэнтрыфікацыі

І ўсё ж будынкі заводаў нярэдка перапрафілююцца. Прыклад — вуліца Кастрычніцкая. Дарэчы, у свеце гэта настолькі распаўсюджаная практыка, што яна нават атрымала назву джэнтрыфікацыі. Гэта значыць, што добрыя будынкі фабрык і заводаў прыстасоўваюць пад галерэі, кафэ і крамы, а нярэдка і пад жыллё. Цяпер падобныя працэсы адбываюцца з заводам «Гарызонт». Але галоўны архітэктар адзначыў, што пакуль тут не вельмі якасна прапрацавана сацыяльная канцэпцыя, якая ляжыць у аснове любой добрай архітэктуры. А тым часам пустуючыя будынкі працягваюць выстаўляцца на аўкцыён: не так даўно ён праходзіў па заводзе імя Кірава, аднак не адбыўся з-за занадта высокай стартавай цаны, 12 верасня адбудуцца таргі па продажы ўчастка былога тралейбуснага дэпо на праспекце Машэрава.

Магчыма, у раёне Плошчы Перамогі з'явяцца новыя дамы.

— Вельмі важна, каб яны візуальна не парушалі ансамбль праспекта, таму будуць уведзены абмежаванні па вышыні, а ў стылістычным вырашэнні будуць выкарыстаны элементы, блізкія да «сталінскай» забудовы. Дарэчы, тут жа з'явіцца і новы дзіцячы сад, — расказаў Павел Лучыновіч.

Адной з самых буйных будоўляў Мінска ў найбліжэйшы час стане шматфункцыянальны комплекс на месцы знесенага «Белэкспа». Яго канцэпцыя распрацоўвалася доўга, адзін з варыянтаў быў выканаты ва ўсходнім стылістыцы, аднак здаўся горадабудаўнікам недарэчным для Мінска. Абмежаваныя будынкі будуць і па вышыні, каб не парушыць ансамбль Верхняга горада, а, наадварот, візуальна злучыць яго з тэрыторыяй Тэатра оперы і балета. З'явіцца там і пешаходны мост, і, верагодна, дзякуючы суседству з комплексам больш актыўна «зажыве» Траецкае прадмесце.

Цяпер вядзецца работа над падрыхтоўкай канцэпцыі Піцерскага квартала ў раёне метро «Пятроўшчына», а паралельна — над Мінскім кварталам у Санкт-Пецярбургу. Забудоўшчыкі ўжо вызначаны, праводзіцца конкурс сярод пяці лепшых архітэктурных бюро беларускай сталіцы і паўночнай сталіцы Расіі. Увосень агульнае журы вызначыць пераможцаў.

Таксама ідзе пошук тэрыторыі для маштабнага выставачнага цэнтра, хутчэй за ўсё, ён будзе знаходзіцца непадалёк ад МКАДа, але ў межах Мінска. Новым досведам для сталіцы стане з'яўленне плошчы раённага значэння на тэрыторыі комплексу «Маяк Мінска». Актыўна будзе развівацца і азеляненне горада, у прыватнасці, у заходняй яго частцы — па прыкладзе Сцяпянскай воднай зоны на ўсходзе горада.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Аты-баты

# НАПЯРЭДАДНІ СТАРТУ

**Беларускія і расійскія вайскоўцы рыхтуюцца да сумеснага стратэгічнага вучэння «Захад-2017»**

**Каб на высокім узроўні забяспечыць яго тылавую і тэхнічную часткі, а таксама эфектыўна ўзаемадзейнічаць падчас сумесных дзеянняў, ваеннаслужачыя дзвюх краін ужо некалькі дзён запар адпрацоўваюць адпаведныя задачы.**

Сумеснае спецыяльнае вучэнне з сіламі і сродкамі тылавога, тэхнічнага (матэрыяльна-тэхнічнага) забеспячэння ўзброеных сіл Беларусі і Расіі, якое ўпершыню праводзіцца ў такім фармаце, разгарнулася на тэрыторыі трох абласцей — Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай, а таксама ў пунктах пастаяннай дыслакацыі адпаведных вайсковых часцей. У вучэнні задзейнічана каля 500 адзінак спецыяльнай і аўтамабільнай тэхнікі, больш за 2,5 тысячы ваеннаслужачых.

Апошнія адпрацоўваюць пытанні тэхнічнага прыкрыцця аб'ектаў на ўчастках ваенна-аўтамабільных дарог, арганізацыі інжынерна-аэрадромнага і аэрадромна-тэхнічнага забеспячэння пасадкі на аэрадромны ўчастак дарогі і паўторнага вылету лятальных апаратаў. Акрамя гэтага, на практыцы ажыццяўляецца абсталяванне ўчасткаў загрузкі боепрыпасаў на аўтатранспарт з выкарыстаннем сродкаў механізацыі пагрузачных работ, эвакуацыя, рамонт і аднаўленне няспраўных узораў тэхнікі і ўзбраення, разгортванне палявога магістральнага трубаправода, участкаў масавай запраўкі тэхнікі, нават выпечка і выдача хлеба. Да задач па прымяненні Адзінай рэгіянальнай сістэмы процілаветранай абароны Беларусі і Расіі па забеспячэнні ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы прыступілі і авіятары.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Справы духоўныя

# ПАПОЎНІЦЦА САБОРНАЯ СКАРБНІЦА

**У сталіцу прыбудуць мошчы Марыі Магдаліны**

**У наступную суботу ў праваслаўны Свята-Духаў кафедральны сабор Мінска прыбудзе часцінка мошчаў святой роўнаапостальнай Марыі Магдаліны. Яна застанецца на пастаяннае захоўванне. Так, 26 жніўня адзначаецца адданне (апошні дзень пасвята) Праабражэння Гасподняга і дзень памяці Мінскай іконы Божай Маці, якая захоўваецца ў саборы. Сустрэча мошчаў адбудзецца ў 17.45, напярэдадні нядзельнага ўсяночнага трывання. Узначаліць яе мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.**

Як паведаміў «Звяздзе» **клірык сталічнага Свята-Духава кафедральнага сабора іерэй Андрэй ЛАМАКІН**, пакланіцца мошчам можна ўсім, хто неабыякавы да праваслаўнай веры. «Ёсць у народзе такое меркаванне, што пэўнаму святому варта маліцца пра канкрэтную праблему. Але гэта язычніцка-магічнае ўяўленне, бо да святых мы звяртаемся як да нашых старэйшых братоў і сясцёр у веры і просім іх маліцца за нас перад Богам, — тлумачыць айцец Андрэй. — Іншая справа, што ёсць звычай, калі на аснове жыццяпісу святога звяртаюцца менавіта да яго. Напрыклад, ёсць святы вялікамучанік Іаан Сачаўскі, які ў свой час быў, калі казаць па сучасны лад, бізнесменам. Вёў гандаль сумленна, і за гэта быў забіты. Таму да яго звяртаюцца па дапамогу тыя, хто вядзе ўласную справу. Але гэта не значыць, што святы Іаан можа дапамагчы ў просьбе, а Марыя Магдаліна — не. У любым выпадку дапамагаюць не яны, а Гасподзь. Святыя моляцца за нас і просяць у Бога аб дапамозе незалежна ад просьбы».

Святая роўнаапостальная Марыя Магдаліна — адна з жонак-міраносіц, удастоеная быць першай сведкай Уваскрэсення Хрыстовага. Пасля Узнясення Збавіцеля святая шмат працавала ў хрысціянскім дабравесці, за што была названая Царквой роўнаапостальнай. Мошчы Марыі Магдаліны раней знаходзіліся ў Эфесе, адкуль перанесены ў Канстанцінопаль. Пасля былі падзеленыя, большая іх частка цяпер знаходзіцца ў Заходняй Еўропе. Адна з часцінак мошчаў — у Ільінскім Адэскім мужчынскім манастыры (перанесена туды з Бельгіі), адкуль прыбудзе 26 жніўня ў мінскі Свята-Духаў кафедральны сабор.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Моцныя дажджы і вецер да 22 м/с

**Непагадзь хутка міне, і ўжо бліжэй да выхадных ізноў пацяплее, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Сёння на тэрыторыі краіны пачаў гаспадарыць паўднёвы цыклон, які будзе перамяшчацца ўздоўж нашых усходніх межаў. Ён прынёс ва ўсходнія раёны моцныя дажджы. У наступныя суткі ён працягне аказваць уплыў на надвор'е ў краіне. Таму будзе дажджлівa і ветрана. У чацвер у Мінскай, Магілёўскай і асобных раёнах Гомельскай вобласці прагназуюцца моцныя дажджы. У Брэсцкай і Гродзенскай абласцях дажджы будуць не такімі інтэнсіўнымі і зацяжнымі. У многіх раёнах краіны чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—22 м/с. Тэмпература паветра ўдзень будзе плюс 12—18 градусаў, па паўднёвым захадзе да 19—21 цяпла.

Дзмітрый Рабаў паведаміў, што, пачынаючы з пятніцы, цыклон страціць сваю актыўнасць, надвор'е палепшыцца, паветраныя патокі памяняюцца на заходнія, і ў краіну з Заходняй Еўропы накіруюцца больш цёплыя паветраныя масы. Тэмпература пачне павышацца, ўсталюецца ўмерана цёплае надвор'е, а дажджоў стане менш. У пятніцу ўначы па паўночным усходзе, днём у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 6—12 градусаў, удзень — 17—24 цяпла, па поўдні — да плюс 26 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у суботу краіна будзе знаходзіцца на паўднёвай перыферыі цыклона з цэнтрам над Кольскім паўвостравам. У асобных раёнах чакаюцца невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай слабы туман. Вецер заходні ўмераны. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе плюс 9—14 градусаў, а максімальная ўдзень 18—25 цяпла, па поўдні да плюс 26.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# Беларускія кнігавыдаўцы на Пекінскай выставе

**Па традыцыі беларускія кнігавыдаўцы прымаюць удзел у Пекінскай міжнароднай кніжнай выставе, якая праходзіць у сталіцы КНР з 23 па 27 жніўня.**

Значнае месца на беларускім стэндзе займаюць кнігі, выхад у свет якіх прымеркаваны да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

— Мы ўжо палюбілі беларускую кнігу, — дзеліцца ўражаннямі ад выставы спадарыня **Чжан ХУЭЙЦЫНЬ, прафесар, доктар філалагічных навук**. — У нашым 2-м Пекінскім дзяржаўным універсітэце замежных моў працуе цэнтр беларускай культуры. За апошні час дзякуючы Міністэрству інфармацыі Беларусі мы сабралі сапраўдную беларускую бібліятэку. Невыпадкова нашы магістранты і аспіранты падрыхтавалі кнігу пра беларускую літаратуру, дзе ёсць нарысы і пра Скарыну, і пра Купалу, пра Коласа, Максіма Багдановіча, Святлану Алексіевіч.

На выставе гучаў і верш Францыска Скарыны ў перакладзе на кітайскую мову. Гэты пераклад для кнігі «Францыск Скарына на мовах народаў свету» ажыццявіў вядомы кітайскі перакладчык Гаа Ман.

Беларускія выдавецтвы «Пачатковая школа», «Адукацыя і выхаванне», Выдавецкі дом «Звязда» ўчора прадставілі на выставе нямала кніжных навінак адукацыйнай, асветніцкай літаратуры. Удзел выдавецтваў Беларусі на выставе ў Пекіне праходзіць пры падтрымцы пасольства Рэспублікі Беларусь у КНР.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*г. Пекін.*

# Хуткія, экалагічныя, свае

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На словах стваральнікаў, аўтамабіль распрацаваны для гарадскіх умоў. Максімальны запас ходу машыны на адной зарадцы складае каля 100 кіламетраў. Поўная "запраўка" акумулятара ад звычайнай разеткі з напружаннем у 220 В займае каля шасці гадзін, ад трохфазнай (380 В) — чатыры гадзіны. На доследных выпрабаваннях электрамабіль пацвердзіў заяўленыя тэхнічныя характарыстыкі. Цяпер стваральнікі адпрацоўваюць аптымальныя рашэнні ў плане электракампанентаў, удакладняюць іх характарыстыкі і ў хуткім часе плануюць прыступіць да стварэння паўнавартаснага доследнага экзэмпляра.

— На максімальных паказчыкі машыну пакуль не выводзілі, усё ж такі мы яе трохі шкадуем, бо яна існуе ў адзіным экзэмпляры, — прызнаецца **генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Сяргей ПАДДУБКА**. — 110 кіламетраў за гадзіну — гэта пакуль толькі разліковая хуткасць. Пра кошт сказаць пакуль нічога не магу — трэба арганізоўваць серыйную вытворчасць кампанентаў. Наступным нашым крокам стане замена батарэі-накапляльніка, якую мы закупляем у расійскай кампаніі, на беларускі суперкандэнсатар на аснове графену, што распрацоўваецца ў Навукова-практычным цэнтры НАН па матэрыялазнаўстве. З выкарыстаннем айчыннага акумулятара многія характарыстыкі аўтамабіля значна вырастуць.

На практыцы электрамабіль ад звычайнай машыны адрозніваe шэраг момантаў. Першае — практычна абсалютна бясшумны ход (гэта, дарэчы, лічыцца праблемай электратранспарту — у некаторых краінах на яго спецыяльна ўстанаўліваюць гукавыя сігналізатары). Другі аспект — экалагічнасць, бо аб'ём шкодных выкідаў электрапрывода роўны нулю. Нельга не адзначыць і эканамічнасць — ККД рухавіка даходзіць да 98 працэнтаў (у звычайным аўтамабілі — каля 50), акрамя гэтага, тут выкарыстоўваецца сістэма рэкуперацыі (пры тармажэнні адбываецца зарадка батарэй). Усё гэта значна адбіваецца на кошце эксплуатацыі — цана 100 кіламетраў шляху складае ўсяго 2—3 рублі. Гэта ў разы меней, чым цэны на паліва.

— Аўтамабіль дынамічны, разганяецца добра, **— сказаў намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА**, які адным з першых правёў тэст-драйв распрацоўкі. — Даўно езджу на машыне з аўтаматычнай каробкай перадач. Розніцы не адчуў: што едзеш на А8, што на электрамабілі. Я ўпэўнены, што за электратранспартам будучыня. Гэта пытанне экалогіі, а таксама эканомікі. У сувязі з уводам у эксплуатацыю Беларускай атамнай электрастанцыі стаіць задача павелічэння выкарыстання электрычнай энергіі. Мы распрацавалі зарадную прыладу, якая будзе называцца «Віцязь». Гэта вельмі зручна — можна ўстанаўліваць яе каля дамоў, супермаркетаў, на стаянках.





Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Адным з першых на веласіпедзе з матор-колам праехаўся старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр ШУМІЛІН.**

Канкрэтных перамоў па вытворчасці электрамабіля ў серыі яшчэ не вялося, але ў НАН лічаць, што гэта пытанне часу — ужо праз тры—чатыры гады беларуская машына можа паступіць у продаж. Разглядаецца як варыянт супрацоўніцтва з «БелДжы», так і стварэнне ўласнага прадпрыемства на базе Нацыянальнай акадэміі навук.

— Мы ў стане зрабіць стапрацэнтную лакалізацыю гэтага аўтамабіля, — упэўнены **старшыня Прэзідыума НАН Уладзімір ГУСАКОЎ**. — Цяпер думаем над стварэннем уласнага канвеернага цэха, у той жа час БелАЗ прапаноўвае распачаць вытворчасць у іх, «Белкамунмаш» — у іх. Трэба палічыць, дзе гэта будзе выгадна. Але тое, што беларускі электрамабіль будзе, — адназначна.

Акрамя электрамабіля, на Рэспубліканскім палігоне для выпрабаванняў мабільных машын паказалі іншыя, магчыма, менш рэзанансныя, але не менш актуальныя распрацоўкі. На прыборабудаўнічым заводзе «Аптрон» Нацыянальнай акадэміі навук у 2017 годзе мадэрнізавалі матор-кола (былі распрацаваны блок кіравання і праграмнае забеспячэнне). Гэта прылада прызначана для ўстаноўкі на самыя розныя механізмы і дазваляе ператвараць іх на сілкаванне ад электрычнасці. Яскравы прыклад выкарыстання — электравеласіпед, пярэдняе кола якога заменена на распрацоўку айчынных навукоўцаў.

— На літый-іонным акумулятары наш веласіпед можа праехаць каля 40 кіламетраў, максімальная хуткасць — 36 кіламетраў за гадзіну, — расказвае **інжынер-канструктар завода «Аптрон» Андрэй ЗАЛУСКІ**. — Шчыра скажу, магутнасць завялікая, таму мы будзем яе памяншаць, што павялічыць запас ходу на адным зарадзе да прыкладна 60 кіламетраў. Гэтага будзе дастаткова для выкарыстання на працягу цэлага дня. Заражаецца энерганосьбіт каля чатырох гадзін. Сам з задавальненнем катаюся па горадзе, ніякіх праблем няма. Нават у гару веласіпед едзе з хуткасцю 15—18 кіламетраў за гадзіну. Уласнай назвы наша сістэма пакуль не атрымала, хочам абвясціць на яе конкурс. Што датычыцца лакалізацыі, то яна роўная 100 працэнтам — усе дэталі беларускай вытворчасці.

Паводле апытання, якое супрацоўнікі «Аптрона» правялі ў спецыялізаваных крамах, на сёння ў сталіцы прададзена каля трох тысяч падобных установак. У асноўным яны кітайскай вытворчасці, каштуюць каля 500 долараў за штуку. Наша распрацоўка будзе прыкладна ў два разы таннейшай. Набываць новы веласіпед не трэба — устанавіць матор-кола можна на любую мадэль. Магчымасць рухацца пры дапамозе педаляў, вядома, застаецца.

— Наша матор-кола можа выкарыстоўвацца таксама ў гіраскутарах, скейтах, самакатах, трохколавым турыстычным транспарце, вазках, сеялках, — падкрэслівае **генеральны дырэктар «Аптрона» Мікалай ЯНКЕВІЧ**. — Абсяг прымянення — самы шырокі, гэта дазволіць нашай краіне развіваць сферу індывідуальнага электратранспарту.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

*lyskavets@zviazda.by*

# ПАМЫЛКІ МАЛАДОСЦІ

## Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў калоніі, дзе сядзяць асуджаныя за наркотыкі



**«Дапамажыце нашым дзецям выйсці адсюль», — з адчаем звяртаюцца да нас жанчыны, калі падыходзім да мужчынскай папраўчай калоніі №22. У «Воўчых Норах» (Івацэвіцкі раён) адбываюць пакаранне асуджаныя за спажыванне, збыт і захоўванне наркотыкаў. У асноўным гэта маладыя хлопцы: 7 з 10 зняволеных няма і 30 гадоў. Таму пад сценамі калоніі заўсёды шмат мам.**



### Працуюць усе, вучацца — па жаданні

У «Воўчых Норах» знаходзяцца тыя, хто асуджаны ўпершыню. Спачатку мужчыны трапляюць на каранцін — у асобны блок. Тут яны жывуць да двух тыдняў: рыхтуюцца да адбывання пакарання, прывыкаюць да распарадку дня.

Цяпер на каранціне чалавек пятнаццаць. У шэра-чорнай аднолькавай форме, усе выстраіліся ў прагулачным дворыку.

— Ёсць тыя, каму яшчэ 18?

Дзве рукі.

Пра тое, як шмат тут маладых, не думаць немагчыма. У кладоўцы, дзе захоўваюцца асабістыя рэчы зняволеных, чытаеш ярлыкі, наклееныя на сумках: 1992 год нараджэння, 1995-ы...

— Цяпер у калоніі пад тысячу асуджаных. Прыкладна 60 з іх — да 20 гадоў, 660 — ад 20 да 30, — прыводзіць статыстыку **начальнік папраўчай калоніі №22 Андрэй КВАШЭВІЧ**.

Усе асуджаныя працуюць — на тэрыторыі змяшчаецца філіял дзяржаўнага прадпрыемства, якое вырабляе мэблю з масіву. Заробкі розныя. У кагосьці 15 рублёў у месяц (столькі каштуе некваліфікаваная праца), у кагосьці — 100. Дзесяць працэнтаў гэтай сумы зняволеным пакідаюць на паход у краму (яна знаходзіцца тут жа), з астатніх можа вылічвацца матэрыяльная і маральная кампенсацыя пацярпелым, выдаткі на ўтрыманне ў калоніі. Месяц утрымання абыходзіцца прыкладна ў 100 рублёў.

— Але ж заробку асуджанага не хапае на гэта. Хто тады кампенсуе, сям'я?

— Не, ніякіх грошай з родных не спаганяецца. Утрыманне аплачваецца дзяржавай, — тлумачыць Андрэй Квашэвіч.

Некаторыя ў калоніі атрымліваюць адукацыю. Так, 20 чалавек дыстанцыйна вучацца ва ўніверсітэце (даступны такія профілі, як менеджмент, маркетынг, эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве, транспартная лагістыка). Тры групы асвойваюць рабочыя спецыяльнасці — сталяр-станочнік, кравец, газаэлектразваршчык.

**«Дасканала памятаю, да секунды, як трапіў сюды. Самыя цяжкія ўспаміны — калі ты яшчэ дома: дзіця ў цёшчы на руках, жонка плача...»**



Фота Вячаслава ЦУРАНАВА.



### Краты ў кабінетах і найлепшая сталовая

Ідзём глядзець медыцынскую часць на тэрыторыі калоніі. Тут ёсць стаматалагічны кабінет, кабінет псіхіятра-нарколага, невялікі стацыянар. — Фінансаванне на лекавыя прэпараты ў нас дастатковае, — расказвае **начальнік медчасці Дзмітрый ЦЯСЛЮК**. — З якімі хваробамі часцей звяртаюцца? Цяпер у 60 працэнтаў пацыентаў звычайныя ВРВІ, нават не грып.

У медчасці, дарэчы, працуюць не толькі мужчыны. Ёсць сярод урачоў і некалькі жанчын. Дзеля бяспекі ў кабінетах, дзе яны вядуць прыём пацыентаў сам-насам, усталяваны краты.

У сталовай тым часам гатуюць абед. На першае — суп, на другое — бульбяная бабка з фаршам. Хлеб «цаглінка» — з пякарні пятай калоніі.

— Сярод арыштантаў кажуць, што ў 22-й калоніі самая лепшая сталовая, — заўважае кухар Юрый.

Юрый і яшчэ некалькі асуджаных дапамагаюць на кухні з гатаваннем. Пра сябе юнак расказвае няшмат. Прафесію кухара атрымаў яшчэ на волі. Чаму апынуўся тут? «Памылка маладосці», — тлумачыць сцісла. За гэтую памылку хлопцу далі восем гадоў. Кажа, ужо крыху адсядзець засталося.

— Тут бібліятэка ёсць, чытаем. На волі столькі часу на гэта не было, — шукае Юрый суцяшальныя плюсы ў новым жыцці.

Некалькі лічбаў. З тысячы асуджаных, што знаходзяцца ў калоніі, каля 600 атрымалі тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў, 290 — ад 10 да 15, 17 чалавек — ад 15 да 20. Выйсці раней можна.

— Асуджаны павінен адбыць палову тэрміну, каб яму замянілі пакаранне на больш мяккае, ці тры чвэрці, каб мець права на ўмоўна датэрміновае вызваленне, — адзначае Андрэй Квашэвіч і апісвае, як вырашаецца гэта пытанне ў кожным канкрэтным выпадку:

— Збіраецца камісія, чытае характарыстыку асуджанага, глядзіць, якія ў яго сацыяльныя сувязі, ці гатовы ён весці на волі нармальны лад жыцця. Важна, каб чалавек прызнаў віну і пагасіў іск.

З пачатку года толькі двум зняволеным «Воўчых Нор» замянілі пакаранне на больш мяккае.

### Не вінаваты я...

«Мне 35 гадоў, і тут я лічуся старым», — сумна ўсміхаецца Сяргей. «На зоне» ён амаль чатыры гады. Сядзіць за спайсы. Як і 75 працэнтаў асуджаных.

— Калі сцісла, то дапамог прыяцелю купіць наркотыкі. Прыяцель не папаўся, гуляе... Я дасканала памятаю, да секунды, як трапіў сюды. Самыя цяжкія ўспаміны — калі ты яшчэ дома: дзіця ў цёшчы на руках, жонка плача...

Дзяцей у Сяргея двое — 5 і 10 гадоў. «Учора ў іх дзень нараджэння быў: сын і дачка з'явіліся ў адзін дзень з розніцаю ў пяць гадоў. Жонка прывозіць іх да мяне раз на год, каб не траўмаваць: калонія не тое месца, дзе дзецям варта бываць. А з жонкай я бачуся кожныя тры месяцы. Лісты ёй пішу, лічу, колькі дзён засталося да сустрэчы: толькі гэтым і жыву... Я яшчэ спяваю тут, іграю ролі ў тэатры».

Свой тэрмін Сяргей не агучвае, але лічыць, што пакаранне вельмі строгае. На яго думку, двух гадоў на зоне цалкам дастаткова, каб усё зразумець.

— А ёсць сярод асуджаных тыя, хто лічыць сябе вінаватым?

— Такіх мала.

Але мужчына не адмаўляе: на здароўі моладзі, якая ганіцца за модай і ўжывае спайсы, многія зарабляюць.

Мінчаніну Максіму 23. У калонію яго адправілі разам з братам.

— Нам патрэбны былі грошы, дзесяць тысяч долараў, — пачынае сваю гісторыю юнак. — Мне — на аперацыю, выдаліць дабраякасную пухліну, брату — на лячэнне жонкі. Яе ўкусіў энцэфалітны клешч. Пакуль зразумелі, што здарылася, яе стан сур'ёзна пагоршыўся.

**«Цяпер у калоніі пад тысячу асуджаных. Прыкладна 60 з іх — да 20 гадоў, 660 — ад 20 да 30».**

Праз інтэрнэт хлопцы знайшлі «работу» — рабіць «закладкі». Хто пастаўляў той спайс, не ведаюць, іх задачай было перакладваць фасаваныя дозы ў іншыя месцы. Займаліся гэтым пару месяцаў. Калі пытаемся, ці шмат зарабілі, Максім пазбягае адказу.

— У 2015 годзе я паступіў сюды. Мы з братам выходзілі з пад'езда дома, і нас затрымалі, — успамінае хлопец.

Братам далі па 14 гадоў пазбаўлення волі. Цікавімся ў Максіма, як ён ставіцца да таго, што асуджаныя за наркотыкі сядзяць у адной калоніі. «З аднаго боку, гэта добра. Мы ізаляваны ад гвалтаўнікоў, — разважае юнак. — З іншага, пастаянна чуць размовы пра наркотыкі ўжо немагчыма».

Сам хлопец, да таго як трапіць у «Воўчыя Норы», вёў нармальны лад жыцця. Займаўся спортам, вучыўся ў двух універсітэтах — на дзённым і завочным аддзяленнях. У БНТУ Максім атрымліваў спецыяльнасць інжынера, у БДУ асвойваў знешнеэканамічную дзейнасць. Менш за год заставалася, каб атрымаць дыпломы. Цяпер дыстанцыйна вучыцца ў калоніі.

— Думаю, цяпер зрабіў бы інакш, — вяртаецца юнак да сітуацыі, якая прывяла яго на зону. — Узяў бы крэдыт, прадаў бы што-небудзь. Але чамусьці ў той момант мы з братам вырашылі, што так дастаць грошы будзе хутчэй.

— Чаго ў калоніі не хапае больш за ўсё?

— Родных і блізкіх...

— Ведаеце, я ўжо 15 гадоў працую з асуджанымі, — дзеліцца начальнік калоніі, калі накіроўваемся да выхаду. — Чую іх гісторыі, стараюся зразумець. А потым гляджу прысуд — і там усё зусім у іншым колеры...

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## Афіцыйна

### БЫЛЫХ ЗНЯВОЛЕНЫХ — У КАЛГАС

Падчас прэс-тура, прысвечанага 97-й гадавіне з Дня ўтварэння крымінальна-папраўчай сістэмы МУС, пра дасягненні і планы сістэмы расказаў **начальнік дэпартамента выканання пакаранняў МУС, генерал-маёр міліцыі Сяргей ДАРОШКА**.

— Мне здаецца, мы многае зрабілі ў плане стварэння належных бытавых умоў для асуджаных. Адрамантавалі памяшканні. За 2018 год прывядзём у парадак яшчэ Брэсцкі следчы ізалятар, а да канца гэтага года — Бабруйскі. Так, ёсць праблема з перанаселенасцю папраўчай калоніі №22, у некаторых пакоях пражывае па 20 чалавек. Але хутка гэта вырашым. Прынята рашэнне аб перапрафіляванні аднаго лячэбна-працоўнага прафілакторыя ў Наваполацку ў калонію. Да верасня ўсё будзе гатова, і нормы па плошчах будуць выкананы.

Пры гэтым, па словах начальніка дэпартамента, размова не ідзе пра тое, што ў нас расце колькасць наркаманаў.

— Практыка па ўтрыманні асуджаных за наркотыкі асобна існуе два гады. Мы лічым, што дасягнулі належнага эфекту. Асноўнай мэтай было — абмежаваць паступленне наркатычных рэчываў. Але вынікі яшчэ вывучым, трэба паглядзець, што будзе з рэцыдывамі.

Дарэчы, пра рэцыдывы. Калі аналізаваць агульную колькасць злачынстваў, то за першае паўгоддзе правапарушэнняў, здзейсненых раней судзімымі, на 7,7 працэнта менш, чым у аналагічны перыяд летась.

Закрануў Сяргей Дарошка і праблему атрымання медыцынскай інфармацыі аб зняволеных і адпаведна іх своечасовага лячэння. «Гэта наша бяда, — прызнаўся ён. — Пакуль атрымаем медыцынскую картку, даведкі асуджанага, праходзіць адзін—два тыдні. Гэта доўга. Каб гэты час мінімізаваць, укараняемся ў адзіную электронную сістэму аховы здароўя. Думаю, за 2018 год усё зробім».

Важны момант — сацыяльная адаптацыя асуджаных.

— Псіхолагі кажуць, што ў закрытай установе чалавек не павінен знаходзіцца больш за пяць гадоў. Існуюць «сацыяльныя ліфты», якія дазваляюць праз пэўны час прэтэндаваць на змякчэнне пакарання. За першае паўгоддзе, напрыклад, у Беларусі 457 чалавек выйшлі па ўмоўна датэрміновым вызваленні. Практычна ва ўсіх месцах пазбаўлення волі ёсць магчымасць атрымаць адукацыю. Многія асуджаныя імкнуцца да гэтага.

У планах МУС — стварыць спецыялізаванае сельскагаспадарчае прадпрыемства, куды будуць ўладкоўваць былых зняволеных. Базай выбралі гаспадарку «Хутар-Агра» пад Светлагорскам. Мяркуецца, што там пабудуюць камбікормавы завод, лінію па пастэрызацыі малака, пашыраць каўбасны цэх, павялічаць пагалоўе свіней і рагатай жывёлы.

— Мы дадзім працоўнае месца чалавеку, дапаможам з дакументамі, жыллём. Чым дрэнна? Такія прадпрыемствы ёсць у Венгрыі, Германіі. Ніхто не кажа аб прымусовай працы.

Калі эксперымент акажацца ўдалым, падобныя калгасы будуць створаны і ў іншых рэгіёнах. Акрамя сацыяльнай адаптацыі асуджаных прадпрыемствы дапамогуць вырашыць і яшчэ адно пытанне — вывесці крымінальна-папраўчую сістэму на самаакупнасць.



# МЕТАД ЛЕВІТА

Як мінімум раз на месяц я пачынаю сумнявацца ў сабе. І тады мне на дапамогу прыходзіць урывак з аднаго ліста. Мастак Сол Левіт даслаў яго скульптару Еве Гесэ ў 1965 годзе, тады, калі яна таксама сумнявалася ў сваіх сілах. «Проста перастань думаць, турбавацца, азірацца па баках, разважаць, сумнявацца, баяцца, пакутаваць, спадзявацца на нейкае простае выйсце, змагацца, збівацца з панталыку, раздражняцца, адмаўляцца, мармытаць, адчуваць сябе няёмка, бурчэць, саромецца, спатыкацца, ашаламляцца, скардзіцца, пунсавець, мітусіцца, стагнаць, наракаць, прасіць, сварыцца па дробязях, чапляцца да дробязяў, паказваць пальцам, доўга чакаць, хадзіць кароткімі крокамі, злавацца, падхалімнічаць, шукаць, вылучацца, тлуміць, тлуміць, тлуміць сябе. Перастань і проста ДЗЕЙНІЧАЙ!»

І што самае цікавае, гэты метад часцей за ўсё спрацоўвае. Як толькі я перастаю знясільваць сябе думкамі, што ні да чаго не здатная, а пачынаю дзейнічаць, сумненні пакрысе знікаюць. І вяртаецца вера ў свае сілы.

Калі ж метад Левіта падводзіць, кідаю ўсе недаробленыя справы і на дзень-два еду да бацькоў. У нязменнае месца сілы. Дзе заўсёды чакаюць і, безумоўна, вераць у мяне. Там можна нічога не казаць, нічога не тлумачыць. А проста легчы на траву, раскінуўшы рукі ў розныя бакі, і доўга-доўга назіраць за аблокамі. Ці прапалоць маміны клубніцы, а потым прыхіліцца стомленай спінай да стога сена і бясклапотна ўдыхаць знаёмы з дзяцінства водар...

Нядаўна глядзела фільм, у якім галоўная гераіня палову жыцця сумнявалася ў сваіх сілах. Вельмі доўга адкладала сваю дзіцячую мару навучыцца іграць на гітары. А ў 40-гадовым узросце ў яе выявілі рак галаўнога мозга. І толькі ажыццявіўшы сваё жаданне ёй удалося вылечыцца ад смяротнай хваробы. Вы скажаце, гэта проста кіно, але я ведаю як мінімум адзін падобны выпадак з рэальнага жыцця.

Не варта адкладаць сваю мару надоўга. Гэта можа мець дрэнныя наступствы. Таму, калі цяпер вы вельмі востра адчуваеце, што не зрабілі нешта важнае, — самы час, колькі вам ні было б гадоў, усё выправіць!

Перастаць траціць энергію на перажыванні, дрэнныя кнігі, кепскіх людзей. Іх шмат. Як казаў у сваім геніяльным маналогу Міхаіл Жванецкі, усіх не пагартаць. Нават аднаго. Нават свайго. Нават сябе. Час даражэйшы. Жыццё кароткае. Таму варта пражываць кожны дзень як апошні. Памятаць пра галоўнае і расстаўляць прыярытэты, каб не аддаць камусьці імгненне, прызначанае для іншага. У рэшце рэшт, перастаць сумнявацца ў сабе і проста ДЗЕЙНІЧАЦЬ.

Дзве птушкі сядзяць на галінцы. «Што, калі я ўпаду? — кажа адна другой. — Даражэнькая, а што, калі ты ўзляціш?»

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

Сямейная газета
Выпуск №16 (83)

■ Тыя, хто побач

# ВЯЛІКІЯ МАРЫ МАЛЕНЬКАГА АНТОНА

## ПРА ШТО ЁН ДУМАЕ, КАЛІ ЛОВІЦЬ НА САБЕ ЦІКАЎНЫЯ ПОЗІРКІ

**Антону МАКАРАНКУ — 36 гадоў. Апошнія шэсць з іх ён працуе паштальёнам. Кажа, што, дзе б ні з'явіўся, на яго ўсе звяртаюць увагу... З-за росту. А рост у самага маленькага паштальёна Беларусі — усяго адзін метр трыццаць сантыметраў. Падчас нашай размовы ўсмешка практычна не сыходзіла з твару маладога чалавека. Ён, дарэчы, нарадзіўся 1 красавіка, у дзень смеху. «Магчыма, таму люблю смяяцца, — кажа Антон. — Ды і ад таго, што я буду хадзіць паўсюль пануры, нікому добра не будзе — ні мне, ні іншым».**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Гэта па-нашаму!

# «МЫ З МУЖАМ НАВАТ НА ДЗЕНЬ НЕ РАЗЛУЧАЛІСЯ»

## Сям'я з Віцебска шые падушачкі — каб як мага больш людзей жылі душа ў душачку

**Некалькі гадоў запар падчас «Славянскага базару» я назірала за адной парай рамеснікаў. Муж і жонка ў строях з арнаментам вельмі хораша глядзеліся побач з падушачкамі ў беларускім стылі. Маю ўвагу адразу ж прыцягнула расцяжка, якая заклікала: «Купіце падушачку, каб жылі душа ў душачку». Падумалася, што гэтыя людзі, відаць, дакладна ведаюць, як пражыць разам шмат гадоў і захаваць цёплыя адносіны. І не памылілася. Таццяна і Леанід Пятровы вось ужо 33 гады жывуць душа ў душачку і ахвотна пагадзіліся падзяліцца сакрэтам сямейнага шчасця.**

— Мы з мужам пасля вяселля нават на дзень не разлучаліся, — усміхаецца Таццяна Аляксандраўна. — У маладосці ў нас быў іншы сямейны бізнес, цяпер вось шыем падушачкі. Я ж мадэльер-канструктар па адукацыі. Пачыналі са звычайных, набітых сінтэпонам. А потым неяк па лужку побач з лецішчам збіралі чабор для гарбаткі на зіму, і нарадзілася думка набіць падушкі духмянымі зёлкамі. Гэта ж які водар будзе! Спачатку пашыла дзве — сабе і мужу. Апрабавалі — спадабалася.

***— І зараз дома спіце на такіх падушках?***

— А як жа ж! — уступае ў размову спадар Леанід. — Яны ж на 100 працэнтаў натуральныя і экалагічныя. Нават зімой у нашай кватэры жыве лета, з водарам свежаскошанага сена, чабору, меліссы, мяты, ліпы...

— Удыхаеш гэты гаючы водар перад сном і супакойваешся, адрываешся ад дрэнных думак, клопатаў. Лепш за валяр'яну дапамагае супакоіцца. Раней я магла па некалькі разоў прачынацца сярод ночы, а цяпер забылася, што такое бяссонніца.

— Вось так перад сном і прыйшла ідэя: а чаму б іншых людзей не радаваць такімі падушачкамі?



Фота Надзеі ДРЫЛЫ.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Сямейная пошта

# Пісьмо пра шчасце я так і не атрымаў

Я ехаў з турысцкага паходу па Карэльскім перашыйку. Шлях мой ляжаў праз Санкт-Пецярбург, горад, што заўсёды прыцягваў маю ўвагу сваёй багатай гісторыяй. І цяпер, карыстаючыся выпадкам, я яшчэ раз захацеў прайсціся па яго ажыўленых праспектах, шырокіх вуліцах. Гуляючы па горадзе, я звярнуў увагу на краму з вельмі ўжо яркай шыльдай «Ювелірныя вырабы». Чамусьці захацелася зайсці туды.

У вітрынах з падсветкай з розных бакоў усё так і зіхацела. Выбар быў захапляльны, на любы густ і гаманец.

Ужо хацеў выйсці з крамы, але маю ўвагу прыцягнула постаць жанчыны, якая падалася вельмі знаёмай. Яна выбірала сабе пярсцёнак з каштоўным каменем. Падышоў бліжэй да вітрыны, жанчына павярнулася, і мы пазналі адно аднаго. Ды і як не пазнаць, калі гэта была мая вучаніца.

ГАЛЯ энергічна працягнула мне руку. Я таксама быў вельмі рады такой сустрэчы, бо заўсёды настаўніку прыемна бачыць тых, каго ён калісьці рыхтаваў да самастойнага жыцця. Каб пагутарыць, мы выйшлі з крамы і пайшлі ў бліжні скверык. Успаміналі школьныя гады, Галіных аднакласнікаў. Я прыглядаўся да Галі і мне чамусьці падалося, што яе нешта трывожыць і не дае душэўнага спакою. Хоць прыгожы выгляд, шыкоўнае адзенне, дарагія для звычайнага дня ўпрыгажэнні гаварылі пра тое, што жыве яна ў спрыяльных умовах, матэрыяльна забяспечаная. І, як высветлілася крыху пазней, мае падазрэнні мелі падставу. Галя прызналася, што яна не знайшла свайго шчасця.

— Пётр Паўлавіч, відаць я вінаватая перад сваімі настаўнікамі, што пачала сваё жыццё не так, як вы мяне вучылі, — гаварыла яна. — Памятаеце, я ж была добрай вучаніцай.

Сапраўды, я добра памятаў Галю — выдатніцу, спартсменку, аматара мастацкай літаратуры, завадатара і арганізатара розных спраў. І прыгажуню — на яе ўпотай заглядваліся многія хлопцы. Памятаў, што, скончыўшы школу, яна паступіла ў Ленінградскі медінстытут. Што было далей, я не ведаў. Як расказала Галя, было вось што.

УЖО некалькі гадоў як Галя выйшла замуж. Яе муж — прадпрымальнік. Мае шэраг сваіх крам. Ён намнога старэйшы за яе, але гэта не стала перашкодай для стварэння сям'і.

А потым... Потым пачаліся сямейныя будні. Муж аказаўся не зусім такі, якім яго Галя лічыла спачатку. Праўда, ён ніколі не прыходзіў дадому п'яны, да маладой жонкі ставіўся заўсёды роўна і спакойна. І з цягам часу Галя заўважыла, што яна губляе сваю самастойнасць і становіцца ценем свайго мужа.

«Навошта табе інстытут? — пераконваў ён жонку. — Навошта табе гэтыя прыёмы хворых? Працаваць табе ўсё роўна не будзе патрэбы. Мы можам купіць тое, што нам трэба. І адпачыць на любым узбярэжжы, і дома ўсяго хапае...» І Галя кінула інстытут.

«Жанчына павінна быць заўсёды прывабнай, яна павінна паказаць сябе ў свеце», — казаў ён. І Галя пачала наведваць касметычныя кабінеты, набываць дарагія ўпрыгажэнні, каб выглядаць адпаведным чынам, быць такой, якой хацеў бачыць яе муж. Проста прыгожай, вельмі прыгожай рэччу яго дома. Мне чамусьці захацелася прыпыніць яе расказ, спытаць, як магла яна так хутка згубіць свае цудоўныя юнацкія мары, але я чамусьці ўстрымаўся. Бо ў Галіных вачах было столькі невыказанай разгубленасці. Як на споведзі, яна выкладала мне свае сумненні, усё, што было ў яе на сэрцы. Ёй так хацелася вярнуцца да сваіх юнацкіх мар, убачыць сябе такой, якой яна была ў школьныя гады.



— Вы памятаеце наш дыспут «Шчасце цяжкіх дарог». Памятаеце, як я спрачалася з Васем, які казаў, што для шчасця абавязкова патрэбны камфорт і розныя бытавыя выгоды. А я ж тады сцвярджала, што па-сапраўднаму шчаслівы той, хто выбраў сабе дарогу рамантыкі, хто ўвесь час у пошуках, хто перш за ўсё думае, што зрабіць добрага для іншых людзей. Шчаслівыя тыя, хто не баіцца цяжкасцяў, а перадольвае іх.

Гэты дыспут праходзіў напярэдадні выпускных экзаменаў, і Галя тады гаварыла пра іншыя жыццёвыя дарогі, што выбіраюць смелыя і настойлівыя. І раптам гэты нечаканы фінал: шыкоўная кватэра-клетка, адсутнасць працы і сяброў.

«Раніцай праводжу мужа на работу. Вечарам сустракаю. Толькі і клопату, што прыбраць кватэру, наведваць розныя атэльє ды пагаспадарыць на кухні. І так дзень пры дні. А да мужа я ўжо не так і прывязана. Мы як бы жывём рознымі жыццямі. У яго свая праца, свае інтарэсы і хвалярванні. Яны мне не заўсёды па душы, але што зробіш».

— Ці чула ты што пра Мікалая? — успомніў я юнацкае сяброўства Галі.

— О, у яго вельмі цікавае жыццё. Ён стаў маракам. Жыве ў Мурманску. Шмат падарожнічаў, многае перажыў, многае бачыў. Я яму зайздрошчу. Дарэчы, запрашаў мяне да сябе на работу. А можа, мне сапраўды паехаць, — нечакана сказала яна, апусціўшы вочы. — Я вам абавязкова напішу, раскажу, як склалася маё далейшае жыццё, — сказала яна пры развітанні.

Я доўга чакаў пісьма пра шчасце. Але так і не атрымаў. А хацелася. Бо яно было б сведкам таго, што Галя на дарозе да шчасця. Простага, чалавечага і так неабходнага кожнаму.

**Пётр САЧЫЎКА,**
**заслужаны настаўнік Беларусі,**
*в. Цырын, Карэліцкі раён.*

■ Ёсць праблема

# АСЦЯРОЖНА: ПСІХАЛАГІЧНЫ ГВАЛТ!

## «Чубіць» не кулакамі, а словамі... Гэта як?

**Часцяком сужэнцы ў парыве нянавісці апускаюцца да запалохванняў, забарон сустракацца з роднымі і блізкімі, непрыстойных зваротаў і заўваг. Не менш вар'яцкія спосабы «асадзіць» партнёра — умяшанне ў асабістае жыццё і паталагічная рэўнасць. Асцярожна! Гэта псіхалагічны гвалт! Чаму варта спыніць маральнае ўшчамленне? Да чаго можа прывесці псіхалагічнае насілле? На гэтыя пытанні шукаем адказ у гісторыі 27-гадовай Маргарыты (імя зменена), якая не адзін год пакутавала ад псіхалагічнага гвалту з боку мужа, але паверыла ў свае сілы і пачала актыўна дзейнічаць.**



Да вяселля маладыя людзі сустракаліся восем месяцаў. Аднак спатканні гэтыя цяжка было назваць сапраўдным каханнем. «Дзіўныя былі ў нас адносіны: то мы сустракаліся, то сварыліся без нагоды, — прызнаецца дзяўчына. — Праз месяц ён пачаў закатваць істэрыкі на роўным месцы. Потым я даведалася пра цяжарнасць. Першае пачуццё — страх. Мне цяжка было ўявіць сумеснае жыццё з гэтым чалавекам, пужалі яго перыядычныя праявы агрэсіі. Аднак думкі пра аборт адмяталіся самі сабою. Я пачала жыць па прынцыпе «сцерпіцца — злюбіцца».

Пасля таго, як мы ўпершыню схадзілі на УГД і ўбачылі малога, ён пасадзіў мяне ў машыну і павёз у ЗАГС, — працягвае Маргарыта. — Я была ў разгубленасці: ён нават не папярэдзіў, прапанову не зрабіў, усё вырашыў за мяне». Чалавек не ведаў слова «не». Тады ў машыне сыпаліся мат і абразы. Калі дзяўчына прыйшла дахаты, у яе пачалася істэрыка. Ужо ўвечары хлопец пачаў суцяшаць «каханую», называць лапулечкай...

«Самае галоўнае, на людзях ён паводзіў сябе як самы лепшы мужчына на свеце, — кажа жанчына. — Калі я цяжарная апынулася ў бальніцы, ён пры суседках па палаце гладзіў жывоцік. Дзяўчаты зайздросцілі такім цёплым адносінам. Ведалі б яны, што рабілася ў маёй душы... Я заўсёды баялася яму штосьці сказаць, кантралявала свае думкі, не магла звярнуцца да яго па дапамогу.

Аднойчы ў парыве сваркі ён штурхнуў мяне, цяжарную, і я ледзь не павалілася жыватом на асфальт. Зноў істэрыка, шок, слёзы. Зноў пачаліся банальныя sms-кі. Я спадзявалася на адзінае: мы распішамся і ўсё наладзіцца...

За псіхалагічным гвалтам услед рушыў эканамічны ціск. Муж Маргарыты за два гады сумеснага жыцця ніколі не працаваў, бо прыйшоў да высновы, што ў Мінску няма нармальнай працы для 26-гадовага мужчыны. «Па натуры ён гультай, — сцвярджае Рыта. — Пры гэтым забараняў браць грошы, якія даваў былы муж — бацька маёй дачкі на яе выхаванне. У выніку — мы чацвёра жылі на дапамогу па доглядзе за дзіцем. Даходзіла да таго, што мяне цішком падкормлівала маці: то сырок глазураваны дасць, то бананам пачастуе, бо адчыніш лядоўню, а там — мыш павесілася». Жанчына не магла купіць сабе штаны ўзімку, хадзіла ў падраным абутку, даношвала адзенне сяброўкі, а лішнюю капейку пакідала на малых.

— Яшчэ яго маці ўвесь час вучыла, як я павінна паводзіць сябе з сынам, нягледзячы на мой вопыт. Муж ва ўсім патураў сваёй маці. Не так прыгатавала кашу — я дрэнная матуля, не туды пайшла на прагулку з дзіцем — мяне пазбавяць бацькоўскіх правоў... Мяне ў гэтым пераконвалі, і я насамрэч пачала ў гэта верыць.

Праз некаторы час мы вырашылі здымаць кватэру, бо з маімі бацькамі муж не ўжываўся. Аднойчы паехалі пагасцяваць да яго маці. Паступова я зразумела, што муж і не збіраўся шукаць жыллё для нашай сям'і. Праз некаторы час пачаў зрывацца на маю дачку, таму прыйшлося завезці яе да бабулі. Маці высылала мне яе малюнкі, я чытала ёй казкі па тэлефоне, па начах глядзела на яе фотаздымкі і плакала, бачыліся мы толькі па выхадных...

Разумела, што так жыць невыносна, але баялася штосьці прадпрымаць. На самай справе, я сама ніколі не расказала б пра свае праблемы, каб мяне не падштурхнулі. Нумар гарачай лініі для пацярпелых ад дамашняга гвалту падказаў бацька маёй дачкі. Мы з псіхолагам абмеркавалі мае праблемы, і я зразумела: тое, што адбываецца ў маёй сям'і, — гэта псіхалагічны гвалт. Разам мы разгледзелі розныя варыянты развязкі маёй праблемы, змадэлявалі магчымыя будучыя жыццёвыя сцэнары, спецыялістка растлумачыла мае правы і падказала, куды трэба звярнуцца. З моманту першага звароту на лінію прайшло каля чатырох месяцаў. Увесь гэты час я знаходзіла эмацыянальную падтрымку па тэлефоне ў спецыялістаў. Дзякуючы гэтай падтрымцы я стала ўпэўненай, здолела прааналізаваць свае адносіны і знайсці ў сабе сілы ўсё змяніць».

У хуткім часе жанчына цішком падала дзве заявы ў суд — на развод і на выплату аліментаў — і пачала чакаць...

— У той дзень я варыла суп, ён гуляў з дзіцем на вуліцы. Мне прыйшло на тэлефон sms-паведамленне, што мяне выклікаюць у суд у якасці істца. Я чакала, калі прыйдзе яму. Потым пачаўся 2-гадзінны скандал.

Яшчэ не адзін раз былы муж заходзіў да Маргарыты з папрокамі, запалохваннямі і абразамі, хацеў дзяліць праз суд дзіцячыя рэчы і пасляродавыя грошы. Пасля разводу жанчына падала на яго заяву ў міліцыю за абразы, яму далі штраф, пасля чаго пачаў падбіраць словы пры зносінах з маці свайго сына. «Маё першае пачуццё пасля разводу, быццам я скінула заплечнік, які быў нагружаны цяжкім каменнем, — усміхаецца наша гераіня. — Я зноў самаўпэўненая жанчына, мне зноў хочацца жыць і бачыць, як растуць дзеткі, хочацца хадзіць па магазінах, прыбірацца і фарбавацца, я зноў шчаслівая.

**Алена ВОЎКАВА**

### ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

У Беларусі псіхалагічны гвалт хоць раз у жыцці перажывалі 82,1% жанчын і 70,9% мужчын. Пад гэты від насілля падпадаюць пераважная большасць жанчын незалежна ад сацыяльна-дэмаграфічных характарыстык і мужчыны ва ўзросце 18—29 гадоў, якія маюць няпоўную сярэднюю або сярэднюю адукацыю і жывуць у сельскай мясцовасці, з нізкім узроўнем матэрыяльнага дабрабыту.

Каля 50% мужчын і жанчын лічаць, што ў адносінах паміж мужам і жонкай дазволена рэўнасць, каля 39% мужчын і жанчын не выключаюць магчымасці ўмяшання ў асабістае жыццё партнёра і выкарыстоўваюць непрыстойныя жарты і заўвагі, каля 34% сужэнцаў дапускаюць лаянку ў зносінах з партнёрам.

### ШТО РАІЦЬ ПСІХОЛАГ?

«Псіхалагічны гвалт, як і любы іншы від насілля, ні ў якім разе трываць нельга, — раіць **Наталля ПЯТРОВА, псіхолаг-кансультант агульнанацыянальнай гарачай лініі для пацярпелых ад дамашняга гвалту МГА «Гендарныя перспектывы»**. — Гэта любыя абзыванні, знявагі і патрабаванні, пададзеныя ў грубай форме, шантаж, крык, лаянка, заўсёдныя папрокі, прымус да чаго-небудзь, паталагічная рэўнасць, любы кантроль. Калі словы зневажаюць годнасць і прыносяць псіхалагічныя пакуты, калі ад іх партнёру робіцца дрэнна, балюча, невыносна, калі пачынае падаць самаацэнка — гэта, без сумнення, прыкметы псіхалагічнага насілля. Трэба адразу казаць партнёру, што не падабаецца, прапаноўваць альтэрнатыву. Трэба цвёрда выбудоўваць свае межы і даваць адпор: «так са мной не рабі — гэта зневажальна і недапушчальна».

■ Быць разам

# НАЙЛЕПШЫ РЭАНІМАБІЛЬ — МАМА

## Што рабіць, калі немаўля паспяшалася нарадзіцца

**Фёдар нарадзіўся ў 27 тыдняў, важыў 990 грам, Ульяна — у 27 тыдняў з вагой 520 грам, Аляксандра — 25 тыдняў, вага — 840 грам, Лера — 25 тыдняў, вага — 660 грам. Усіх гэтых дзетак выратавалі з дапамогай складаных медыцынскіх механізмаў, дарагіх лекаў і першакласных дактароў. Фёдару цяпер 3 гады, Ульяне — каля 2,5, Аляксандры — амаль 2, Леры — 5 гадзікаў. Штогод у Беларусі нараджаецца каля 4,5 тысячы такіх «ранніх» дзетак. 90% з іх выжываюць, а 60% — вырастаюць здаровымі.**

### Пяць страхаў на кожную паперку

Першыя тыдні і нават месяцы свайго жыцця немаўляты, якія нарадзіліся раней за тэрмін, праводзяць у бальніцах, на апараце штучнай вентыляцыі лёгкіх. Далей — несупынныя масаж, плаванне, лячэбная фізкультура, заняткі па развіцці псіхікі, эмоцый, інтэлекту і... страх, што дзіця застанецца інвалідам.

Каб дапамагчы бацькам выйсці са стрэсу, зразумець, што адбылося і як клапаціцца пра паспешлівых малых, вясною гэтага года ў Беларусі з'явілася аб'яднанне «Рана». Амаль усе яго сябры — бацькі неданошаных дзетак, якія на ўласным вопыце ведаюць, што гэта такое.

— Тэма неданошаных дзяцей і заўчасных родаў — гэта заўжды шмат статыстычнай інфармацыі: рост, вага, тэрмін гестацыі дзіцяці. Аднак мы хочам паказаць, што неданошаныя — гэта не толькі статыстыка, а рэальныя малыя і сем'і са сваімі гісторыямі: паспяховымі і не вельмі, сем'і, якім неабходна медыцынская і псіхалагічная дапамога і падтрымка, — выказалася **Юлія МАКОЎСКАЯ, старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання бацькоў неданошаных дзяцей «Рана» (далей — РГА «Рана»).**

Інфармацыя — гэта першае, што патрабуецца бацькам немаўлят, якія з'явіліся на свет раней за тэрмін, упэўненая **Алена ГРЫГОР'ЕВА, член праўлення РГА «Рана»:**

— Бацькі неданошаных дзетак звычайна пачынаюць шукаць інфармацыю ў інтэрнэце, а там яна можа быць вельмі супярэчлівая і нават дэструктыўная. На адно і тое ж пытанне можна знайсці шмат розных адказаў. І тэматычныя сустрэчы са спецыялістамі, якім мы давяраем, — паратунак у такой сітуацыі.

Арганізацыя ўжо правяла некалькі тэматычных сустрэч з рэабілітолагам, гастраэнтэролагам, акулістам. Плануюцца трэнінгі для бацькоў, для якіх важна не толькі пачуць, што рабіць, але і пабачыць, як гэта трэба рабіць. Ёсць попыт і на індывідуальнае сямейнае кансультаванне. На сайце працуе форум, дзе бацькі кантактуюць і дэталёва дзеляцца вопытам і праблемамі, з якімі яны сутыкаліся. Такім чынам «Рана» здымае псіхалагічнае напружанне бацькоў.

— Мы канцэнтруем нашы веды на ўласным вопыце, які мы як бацькі самі атрымалі, і гэта моцны бок нашай арганізацыі. Плануем выдаваць і друкаваныя матэрыялы, бо мамы і таты хочуць мець паперу, дзе было б у дэталях напісана, як сябе паводзіць і што рабіць. Мой сын нарадзіўся на 30-м тыдні, і яшчэ год таму я была ў бальніцы і шмат што здавалася мне нерэальным. На кожную паперку, што мы атрымалі пры выпісцы, у мяне было па пяць страхаў — што рабіць?! Цяпер мой сын падрос, і я як маці пасталела. Толькі з гэтым дзіцем (а ў мяне ёсць яшчэ і старэйшае) я зразумела, якое гэта дасягненне: умець пераварочвацца, выдаць першы гук, — дадала Алена Грыгор'ева. — Псіхалагічная падтрымка патрабуецца, дарэчы, не толькі бацькам неданошаных дзетак, але і іх бабулям з дзядулямі. Часта яны могуць параіць нешта непатрэбнае маме, пакуль тая ў стане стрэсу, таму стараемся працаваць з усімі членамі сям'і.

### Не заставацца з праблемай сам-насам

Практычны досвед членаў арганізацыі «Рана» — неацэнны ўнёсак у развіццё медыцынскай справы, што прызнаюць і медыкі, якія ратуюць немаўлят.

— Мы, напэўна, не валодаем усім аб'ёмам ведаў, які маюць бацькі, што на практыцы асвоілі інфармацыю пра неданошаных дзетак. Такі вопыт набываецца ў працэсе, менавіта таму гэтая арганізацыя такая патрэбная, — выказала меркаванне **Валянціна ВАЎЧОК, галоўны педыятр аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Беларусі.** — Аднак адно павінна быць нязменным: каб парадзіха своечасова была ў адпаведным месцы, бо найлепшы рэанімабіль — гэта мама.

Агляд неданошанага дзіцяці — не складаная рэч і не займае шмат часу, а львіную долю ў ратаванні малога займаюць гутарка з маці і тлумачэнні, што рабіць, лічыць **Канстанцін ВІЛЬЧУК, дырэктар РНЦП «Маці і дзіця»:**

— На жаль, на псіхалагічную дапамогу ва ўрача часта проста не хапае часу. Грамадскае аб'яднанне запаўняе гэтую нішу. У нас часта пытаюцца, навошта выходжваць такіх дзяцей. Але калі бачыш гэтых малых пасля, праз год ці два — разумееш, што за кожнага трэба змагацца. У 2000 годзе мы ратавалі каля 26% дзяцей, якія нарадзіліся з вагой да кілаграма, а летась выжыла ўжо больш за 75% такіх немаўлят. Частка з іх маюць інваліднасць, аднак узровень яе ў гэтай групе дзяцей не ўзрастае, а спецыяльнае харчаванне дазваляе зніжаць ступень страты здароўя.

Спецыяліст зазначыў, што да кожнага народжанага індывідуальны падыход: у інкубатарах падбіраюцца чахлы, укладкі, інтэнсіўнасць святла, акуляры. Створана апарацыйная для лячэння на ранніх стадыях рэцінапатыі нованароджаных — хвароба вачэй, ад якой пакутуе амаль кожны пяты неданошаны і якая можа скончыцца поўнай слепатой.



Фота Сяргея ЛЕСКІЧА.

**Для таго, каб раннія немаўляты нармальна развіваліся, іх кладуць у боксы і накрываюць спецыяльнымі чахламі.**

— Толькі пра 10% неданошаных немаўлят пры аглядзе адразу можна сказаць, што яны будуць мець праблемы ў далейшым. Як складзецца лёс астатніх — ніхто не спрагназуе першапачаткова, — дадаў ён.

Дабрабыт дзіцяці напрамую залежыць ад сям'і, а не ад медыцыны ці сацыяльных работнікаў. Толькі сям'я можа паўнацэнна выхадзіць дзіця, ніякі дагляд у спецыялізаванай установе не зробіць таго, на што здольны бацькі, упэўнена **Алена ЦІТОВА, старшыня грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам» (ГА «БелАДДІіМІ»).**

Алена Цітова — сама маці сына, які 25 гадоў назад нарадзіўся вагой 1,9 кг і два месяцы «падрастаў» у бальніцы:

— Палова з таго, што нам казалі дактары, не апраўдалася, бо немагчыма ведаць, на якія цуды могуць быць здольныя самі дзеці з дапамогай сям'і.

Арганізацыя «БелАДДІіМІ» аб'ядноўвае больш за 2,5 тысячы сем'яў па ўсёй Беларусі. І ў 70% сем'яў, дзе нарадзіліся неданошаныя дзеці, гэтых малых сёння немагчыма адрозніць ад звычайных. Па словах старшыні асацыяцыі, 80% сем'яў — гэта адзінокія мамы, бо «таты сышлі праз тое, што побач не было людзей, якія казалі б пра перспектывы немаўляці, якія б падштурхоўвалі працаваць з малым, якія б матывавалі бацькоў на змаганне». Аднак ёсць прыклады, дзе сем'і з неданошанымі малымі з вельмі цяжкімі парушэннямі застаюцца поўнымі, і ў іх ужо падрастаюць другія і трэція дзеці. Галоўнае — не заставацца сам-насам з праблемай і ведаць, дзе шукаць параду і дапамогу.

**Ірына СІДАРОК.**

*sidarok@zviazda.by*

■

■ Фотаздымак з гісторыяй

# КАЛЯ БАЦЬКОЎСКАЙ ЛІПЫ

**ШЧЫМЛІВА і самотна душы, калі разглядаю фотаздымак, які беражэ памяць пра сям'ю з вёскі Дварэц на Любаншчыне ўжо 61 год.**

Лідзія Рыгораўна выйшла замуж за Данілу Нічыпаравіча Мігуна ў першы пасляваенны год. (У цэнтры сястра Лідзіі Алена, якая ў час карнай аперацыі фашыстаў трапіла ў палон і была вывезена ў Нямеччыну, дзе працавала на авіязаводзе. Дамоў вярнулася пасля вызвалення. Лёс звёў яе з удаўцом Сямёнам, разам з ім выгадавалі пяцёра яго дзяцей.) Побач з Лідзіяй і Данілам іх дзеці: Васіль, Вольга, Каця, Марыя, Ліда (не стае толькі Аляксандра, які нарадзіўся пазней).

Данілу Нічыпаравіча ў маленстве гадавала мачыха, і таму ён вельмі рана (у 8 гадоў) пайшоў на свой хлеб. Пасвіў жывёлу, касіў, малаціў, калі крыху падрос. У лістападзе 1939 года прызваны ў войска. У першыя дні вайны разам з аднапалчанамі трымаў абарону на заходніх рубяжах. Падвозіў снарады аўтамашынай на баявыя пазіцыі. 4 снежня калона трапіла пад бамбёжку. Уцалелых захапілі ў палон. На шосты дзень палону вартавыя ўначы паднялі знямоглых, адлічылі дваццаць чалавек і павялі за тэрыторыю часовага лагера. Мільганула думка — расстрэл. Але трэба было выцягнуць грузавік, які праваліўся ў багну. Падчас мітусні Даніла схаваўся ў хмызняк, а потым ірвануў у лясны гушчар.

Да родных мясцін дабіраўся шмат дзён і начэй. Падлячыўся і стаў партызанам атрада Варашылава брыгады імя Гуляева. Прымаў удзел у аперацыі «Рэха на Палессі» па падрыве чыгуначнага моста цераз раку Пціч. Ажаніўся з Ахрамейкай Вольгай Макараўнай, у сям'і нарадзілася дачушка. Вясной 1944 года ў час апошняй блакады абараняў падыходы да партызанскай зоны за некалькі кіламетраў ад вёскі Дварэц.





**Сын Лідзіі і Данілы — Аляксандр. Калі рабіўся сямейны фотаздымак, яго яшчэ не было.**

Неспакойна было на душы партызана-кулямётчыка. Пасля бою з дазволу камандзіра з сябрам падаўся ў родную вёску. Калі падышоў да кураня ў лесе, дзе хавалася сям'я, сэрца сціснулася ад болю, бо ляжалі там скошаныя аўтаматнай чаргой яго родныя: сястра, жонка з аднагадовай дачушкай, дзве яе сястры і маці, мачыха. З сябрам перацягнулі на посцілцы родных на пясчаны грудок ва ўрочышчы Мінкава і пахавалі ўсіх у адной магіле каля дуба.

Закончыў вайну ў Дрэздэне. Вярнуўся дамоў, і праўленне калгаса даручыла франтавіку выконваць абавязкі брыгадзіра паляводчай брыгады. У суседняй брыгадзе кіраўніком была Лідзія Макарава. Пасля нядоўгіх разваг яны вырашылі разам будаваць сваё сямейнае шчасце.

У гады вайны Лідзія дапамагала партызанам атрада Давыдава, дзе ў баявых аперацыях удзельнічалі два яе браты. Па даручэнні камандавання выконвала розныя заданні: падвозіла прадукты, бярвенне для будоўлі зямлянак, вазіла зерне для памолу ў вёску Камаровічы; даводзілася маскіраваць аэрадром на востраве Зыслаў і ахоўваць штабное памяшканне ў вёсцы Дварэц, дапамагала параненым партызанам. Пасля вайны гадавала шасцярых дзяцей. Зведала радасць ад нараджэння трынаццаці ўнукаў, 21 праўнука і 2 прапраўнукаў. Лёс адвёў ёй 95 гадоў жыцця. Ва ўсіх дзяцей свае сем'і. Вольга — цырульнік, Васіль — будаўнік (прараб), Марыя шмат гадоў працавала выхавальніцай у інтэрнаце каледжа, Каця — бухгалтар, Ліда — заатэхнік, Аляксандр — кіроўца. Тры дачкі і малодшы сын жывуць і цяпер у вёсцы Дварэц. Часцяком уся вялікая сям'я збіраецца на бацькоўскім падворку каля ліпы, якую пасадзілі бацька з маці ў маладосці. Успамінаюцца церні і радасці жыццёвага лёсу, схіляюцца галовы ў самоце па бацьках, таму што не хапае родных пытлівых вачэй, добрых жыццёвых парад. І, вядома ж, усім прысутным хочацца зазірнуць у будучыню свайго роду. Жыццё працягваецца.

**Анатоль ВЯЛІЧКА, настаўнік, краязнаўца**

■

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з невялікай гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

# ВЯЛІКІЯ МАРЫ МАЛЕНЬКАГА АНТОНА

## «Не хачу хварэць, таму стараюся як мага часцей усміхацца»

На сустрэчу Антон прыехаў на веласіпедзе. Адразу пасля працы. У парку Чалюскінцаў на лавачцы сядзела дзяўчына з гіраскутарам. «О, гіраскутар!» — узрадаваўся Антон. — А можна мне паспрабаваць праехацца?» — «Вядома», — усміхнулася незнаёмка.

***— Антон, не кожны зможа штосьці папрасіць у незнаёмага чалавека. А ў вас гэта атрымалася надзвычай нязмушана...***

— Як кажуць, хто пытае, той не блудзіць. Ніхто ж мяне за гэта біць не будзе, праўда? Калі Саша Мінёнак рыхтаваўся да Еўрабачання, я хадзіў да яго на фансустрэчу. Там пазнаёміўся з дзецьмі з падтанцоўкі. Яны рыхтавалі нумар на гіраскутарах і навучылі мяне кіраваць гэтай штуковінай. Дзеці, у адрозненне ад большасці дарослых, адкрытыя душой. Чым старэйшы чалавек, тым больш у яго стэрэатыпаў, страхаў. А ад мітусні ды пустых перажыванняў, не сакрэт, хваробы ўзнікаюць. Я не хачу хварэць, таму стараюся як мага часцей усміхацца.





Антон побач з Сяргеем Бязруковым падчас здымак «Уланскай балады».

Вось ужо 18 гадоў Антон працуе на Белпошце. Шэсць апошніх з іх звычайным паштальёнам — разносіць лісты, газеты мінчанам, якія жывуць на вуліцах Багдановіча, Някрасава, Усходняй, Бяды.

Лішніх грошай у сям'і ніколі не было, таму хлопец імкнуўся як мага раней стаць незалежным, каб дапамагаць бацькам. Не хацеў сядзець у іх на шыі. Скончыў дзевяць класаў і паступіў у каледж сферы абслугоўвання. Адвучыўся і адразу ж пайшоў працаваць у паштовае аддзяленне.

— Спачатку шчыраваў у офісе. Даводзілася па восем гадзін на дзень праводзіць за камп'ютарам. Вочы стаміліся, зрок пачаў псавацца. Раней пайсці нельга, нават калі ўсё зрабіў. Калі аддзяленне расфарміравалі, пайшоў працаваць простым паштальёнам. І вельмі рады гэтаму. Мая праца мне падабаецца. Чым раней развёз пошту — тым раней вызваляешся. Вось зараз людзі сядзяць у офісах, а я ўжо ў 15.30 сваю работу на сёння скончыў і даю інтэрв'ю.

Спачатку ў мяне не было веласіпеда, даводзілася разносіць пошту пешшу. Спіна балела, ногі. Стамляўся, і больш нічога не хацелася. Ды і жыву я ў Малінаўцы. Грошай шмат на транспарт ішло. На адзін з заробкаў купіў сабе веласіпед. І ведаеце, адчуваць стаў значна лепш. Ды і людзі, калі я еду на веласіпедзе, асабліва самі веласіпедысты, заўсёды мне ўсміхаюцца.

На працы Антону таксама часам дапамагаюць незнаёмыя людзі.

— У адным доме вельмі высока ўсталяваныя паштовыя скрыні. Не дастаю да верху, таму прылаўчыўся прасоўваць канверты знізу праз шчыліны ў скрынях. Газета туды не пралазіць, таму тэлефаную ў канкрэтную кватэру альбо чакаю, пакуль хтосьці з жыхароў вернецца дадому і дапаможа мне.

## «Сонца ўсім аднолькава свеціць»

Антон прызнаўся, што марыць стаць багатым і знакамітым, таму не абмяжоўваецца адной працай.

У вольны час зарабляе грошы ў начных клубах. Падпрацоўвае там аніматарам, шоуменам.

— Па клубах хаджу дзеля грошай. Калі шчыра, гэта ўсё не маё. Што там цікавага? Сядзяць людзі каля барнай стойкі і п'юць. А потым танцуюць ды дзеля забавы фатаграфуюцца са мной. А пасля зранку на працу складана падымацца.

Больш па душы Антону здымкі ў фільмах, кліпах.

**«Я сваё дзіця навучыў бы знаходзіць падыход да любога чалавека. Мне здаецца, свет будзе дабрэйшым, калі ўсе людзі будуць адкрытыя для зносін».**

— На здымкі ў фільме «Анастасія Слуцкая» я трапіў дзякуючы маме. Мы раней выпісвалі газету «Вячэрні Мінск». Менавіта там мама і ўбачыла аб'яву, што кінастудыя шукае акцёра невялікага росту на ролю пажа. Я, вядома, адразу згадзіўся. На працы мяне падтрымалі. Адпусцілі на тыдзень: шэсць дзён я правёў на здымачнай пляцоўцы разам з іншымі акцёрамі, у тым ліку са Святланай Зелянкоўскай, расійскім акцёрам Сяргеем Глушко, вядомым як Тарзан. Пасля гэтых здымак мяне заўважылі і пачалі тэлефанаваць. У асноўным прапаноўваюць ролі ў кліпах.

У прыватнасці, Антон зняўся ў кліпе Ларысы Грыбалёвай. А падчас здымак фільма «Уланская балада» яму пашчасціла пазнаёміцца з Сяргеем Бязруковым.

— Мне падабаецца кантактаваць з творчымі людзьмі, таму, калі бачу аб'яву ў кінастудыі, не раздумваючы прапаноўваю сваю кандыдатуру. Чаго саромецца?! Сонца ўсім аднолькава свеціць.

Але больш за ўсё на свеце Антон любіць музыку. Кажа, пачаў спяваць раней, чым гаварыць. У дзяцінстве браў міскі і стукаў па іх лыжкамі ды відэльцамі, як па барабанах.

У рэпертуары паштальёна ў асноўным эстрадныя папулярныя песні. З задавальненнем выконвае кампазіцыі Тота Кутуньё на італьянскай мове, Томаса Андэрса на англійскай, Аляксандра Сярова, Валерыя Лявонцьева... Яму падабаецца, калі людзі ведаюць тэксты і падпяваюць.

— Я мару выступаць на вялікай сцэне, мець свой фан-клуб. Але пакуль што спяваю ў асноўным на працы, у актавай зале Белпошты. Зрэдку клічуць у караоке-клубы. Я ж хачу, каб мяне часцей кудысьці запрашалі. Мне гэта прыносіць столькі задавальнення! А мара зняцца ў адным фільме з Брэдам Пітам не пакідае мяне ні днём ні ноччу. Абажаю гэтага акцёра.

## «У дзяцінстве я адчуваў сябе іншапланецянінам»

З-за прыроджанай ахандраплазіі — гэта захворванне, пры якім парушаецца рост касцей, — Антона не бралі ў дзіцячы сад.

— Выхавальнікі баяліся, раптам са мной штосьці здарыцца. З-за гэтага я напачатку адчуваў сябе іншапланецянінам. Калі пайшоў у школу, мы жылі на вуліцы Багдановіча. Каля нашага дома хадзіла вялікая колькасць тралейбусаў. Мне чамусьці падабаўся гэты транспарт. Нават марыў стаць кіроўцам тралейбуса і развозіць людзей. Дачы ў нас няма, у летнік мяне таксама не бралі з-за росту. Мне было сумна аднаму на канікулах, таму вырашыў: буду сябраваць з кіроўцамі тралейбусаў. Знаёміўся з імі, залазіў у кабіны, яны мне дазвалялі націскаць кнопку, каб адчыняліся-зачыняліся дзверы. Затое цяпер я ведаю ўвесь Мінск як свае пяць пальцаў. Мне, на жаль, нельга працаваць кіроўцам тралейбуса, бо я не дастаю да педаляў, таму кірую веласіпедам.

***— Ведаеце, у Львове ёсць кавярня, дзе афіцыянтамі працуюць дарослыя людзі маленькага росту...***

— Гэта цудоўна! Сумняваюся, што ўладальнік нашай кавярні ўзяў бы такога, як я, на працу афіцыянтам. А ў Львове, самі ж бачылі, з гэтага робяць фішку. У іх там шмат розных тэматычных кавярняў.

Зараз Антон жыве ў двухпакаёўцы разам з бацькамі.

— Я вельмі ўдзячны ім, што выгадавалі мяне. Шмат выпадкаў, калі дзяцей аддаюць у інтэрнаты, адмаўляюцца ад іх. Гэта жахліва! Часам, калі нараджаецца дзіця з асаблівасцямі, мужчына сыходзіць з сям'і, не вытрымлівае. Але мае бацькі не развяліся, у мяне ёсць малодшы брат. Ён ужо мае асобна. Усе мае сваякі звычайнага росту. Я рады за іх. І нікому не зайздрошчу. Лічу, што ў кожнага свой лёс, свая ўнікальная місія ў гэтым свеце.

Пакуль мы размаўлялі, міма праходзілі і дзеткі, і дарослыя. Усе рэагавалі на Антона па-рознаму: хтосьці глядзеў на яго, як на дзіва, большасць жа хуценька адводзілі позірк. Заўважыла, Антон вельмі абрадаваўся, калі яму ўсміхнулася маленькая дзяўчынка, а потым хлопчык.

— Мне адразу стала так добра, сапраўднае адчуванне палёту на душы. Мару пра сям'ю, уласных дзяцей. Магчыма, яны будуць мець нейкі талент. Бог, спадзяюся, запланаваў мне сустрэць жанчыну, якая пакахае мяне такога, які я ёсць. Калі вучыўся ў каледжы, мне падабалася адна дзяўчына. Але я свае пачуцці трымаў у сабе. Любаваўся ёю здалёк. Стараўся добра вучыцца, каб прыцягнуць увагу. Разумею, што не ў грашах шчасце. Але ўсё адно мару зарабіць іх як мага болей, бо, каб стварыць сям'ю, трэба мець магчымасць яе забяспечваць.

**«Сумняваюся, што ўладальнік нашай кавярні ўзяў бы такога, як я, на працу афіцыянтам. А ў Львове, самі ж бачылі, з гэтага робяць фішку. У іх там шмат розных тэматычных кавярняў».**

***— Якую дзяўчыну бачыце побач з сабой?***

— Любы хлопец, не толькі я, марыць пра прыгожую, гаспадарлівую, разумную жонку. Хоць прыгажосць адноснае паняцце. Калі кагосьці пакахаю, той чалавек для мяне будзе самым прыгожым.

***— А вы самі ўмееце што-небудзь рабіць па доме?***

— Вядома. Я магу веласіпед адрамантаваць, а не толькі ў майстэрню завозіць. Навошта траціць грошы, калі можна самому навучыцца? Кожны чалавек, асабліва мужчына, павінен многае рабіць сваімі рукамі. Пачынаючы ад элементарнага — памыць падлогу — і заканчваючы рамонтам тэхнікі.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## «Сумна, калі дзіця бачыць мяне і хаваецца за маму»

***— Антон, заўважыла, што многія людзі, праходзячы міма, азіраюцца ўслед. Вас гэта не крыўдзіць?***

— Няхай азіраюцца. Што ў гэтым такога? Я люблю быць у цэнтры ўвагі. Калі бачу, што на мяне пільна глядзяць, проста ўсміхаюся. І радуюся, калі мне ўсміхаюцца ў адказ. Але калі азіраюцца са злосцю, адчуваю сябе не ў сваёй талерцы. Быццам бы я ім чымсьці замінаю. А нядаўна пачуў краем вуха: «Глядзі, які маленькі дзядзя на веласіпедзе едзе!» І гэта кажа свайму сыну дарослы чалавек і паказвае ў мой бок пальцам. Таксама сумна, калі дзіця бачыць мяне і хаваецца за маму ці абзывае гномам. Часам і больш крыўдныя словы чую ў свой адрас. Бацькі ў такіх выпадках, як правіла, чамусьці сядзяць і маўчаць.

***— А з якім казачным героем сябе асацыюеце?***

— З Карлсанам, вядома. Я таксама люблю варэнне. І не лічу сябе злым чалавекам.

***— Калі б вы былі на месцы тых бацькоў, як бы выхоўвалі дзіця?***

— Адразу ж, з пялёнак, вандраваў бы з ім па свеце. Паказваў, расказваў. Я быў у Польшчы, Балгарыі, Турцыі, Ізраілі. За мяжой шмат розных людзей на вуліцах, у тым ліку на інвалідных калясках, маленькага росту. Як дрэваў аднолькавых не знойдзеш, так і людзей. Усе розныя. І гэта цудоўна. Я сваё дзіця навучыў бы знаходзіць падыход да любога чалавека. Мне здаецца, свет будзе дабрэйшым, калі ўсе людзі будуць адкрытыя для зносін.

***— І ў Беларусі ёсць дарослыя маленькага росту. Але іх чамусьці практычна не відаць на вуліцах. Напэўна, яны замыкаюцца ў чатырох сценах...***

— Я не замыкаюся. Навошта? Калі няма настрою, наадварот, саджуся на веласіпед і еду катацца. На свежым паветры настрой імгненна падымаецца. Каб не ўпасці ў дэпрэсію, стараюся кантактаваць з такімі ж жыццярадаснымі людзьмі, як сам. Пасля працы час ад часу гуляю ў футбол са школьнікамі. Заўважыў, што цяпер футбольныя палі пустуюць. У маім жа дзяцінстве за мячом пасля школы бегалі практычна ўсе хлопцы. А зараз і школьнікі, і моладзь сядзяць у інтэрнэце. Я люблю футбол, асабліва клуб «Рэал Мадрыд». Уяўляеце, нядаўна паставіў на яго дзве тысячы рублёў і выйграў вельмі вялікую стаўку.

***— Антон, уявіце, што вы сам у сябе бераце інтэрв'ю. Якое апошняе пытанне задалі б сабе?***

— Для чаго я тут, на гэтай зямлі? Якая ў мяне місія ў жыцці? Часта думаю пра гэта. Але пакуль дакладнага адказу не ведаю. Патрэбны ж, відаць, для чагосьці. Можа, кагосьці натхню, вылечу... На вуліцах горада штодзень бачу шмат панурых людзей. Хочацца, каб чалавек, які не любіць сябе, паглядзеў, што я ўсміхаюся, радуюся жыццю, і зразумеў, што і ў яго не так ужо ўсё дрэнна.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
nadzieja@zviazda.by

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

# «МЫ З МУЖАМ НАВАТ НА ДЗЕНЬ НЕ РАЗЛУЧАЛІСЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Разглядаю вырабы сям'і Пятровых больш уважліва. Навалачкі ў беларускім народным стылі, што зручна, здымаюцца. А ўнутры знаходзіцца льняная падушачка з зёлкамі, у якой Тацццяна Аляксандраўна пакідае адтуліну, каб можна было дадаць свой любімы водар.

**«Мама з татам хоць і не размаўляюць у штодзённым жыцці па-беларуску, але яны заўсёды шанавалі і шануюць сваё, роднае. Беларускасць жа — гэта не толькі мова».**

— Мелісу, мяту, мацярдушку вырошчваем на лецішчы за 20 кіламетраў ад Віцебска, чабор збіраем на лузе. І адмысловы лужок у нас ёсць, дзе мы высяваем канюшыну ды іншыя мяккія травы, якімі можна набіваць падушачкі, — кажа Леанід Рыгоравіч.

***— Пасля таго як пачалі рабіць падушкі з зёлкамі, відаць, зменшылася на лецішчы плошча пад бульбу?***

— Вядома, прыйшлося ёй крыху пасунуцца. Хоць я яшчэ разводжу бульбу беларускіх сартоў — гэта маё хобі, — усміхаецца Тацццяна Аляксандраўна. — Таму моцна не пасунеш.

— Улетку ў нас пачынаецца гарачая пара. Косім і сушым лугавыя травы, збіраем зёлкі. Пакуль жонка шые, я набіваю падушачкі, займаюся арганізацыйнымі справамі.

— Мы адно для аднаго — як правая і левая рука. Дарэчы, дачок сваіх я таксама навучыла шыць. Старэйшая Марынка на мінулы «Славянскі базар» пашыла льняныя падушкі з зёлкамі. У яе іншы стыль, з карункамі. Сёлета таксама прапаноўвала ёй далучацца, але ў дачкі вельмі шмат розных спраў, не паспела. Раней Марына працавала загадчыцай літаратурнага аддзела ў тэатры Якуба Коласа, цяпер вядзе гурток інклюзіўных танцаў «Імпэт» пры каталіцкім дабрачынным аб'яднанні «Карытас». У вольны час піша апавяданні і вершы на роднай мове. Гэта ж яна нам прыдумала слоган «купіце падушачку, каб жылі душа ў душачку».

У гэты момант якраз падышла, каб адпусціць бацькоў на абед, Марына.

— Мне нават нічога прыдумваць не давялося. Ёсць такі абрад — адорванне маладых на вяселлі: «Дару палена, каб муж маладую пацалаваў у калена. Дару бярозу, каб муж дадому прыходзіў цвярозы. Дару падушачку, каб жылі душа ў душачку». Гэта традыцыйная фраза, яна проста дарэчы прыйшлася. Я, хоць нарадзілася ў горадзе, з дзяцінства цікаўлюся фальклорам. Заахвочвала дзяцей, якія, як і я, прыязджалі на лета ў вёску, ладзіць канцэрты для мясцовых бабулек. Мы заходзілі ў кожную хату і спявалі ўсё, пачынаючы ад эстрадных і заканчваючы народнымі песнямі. У студэнцкія часы я з такімі ж аматарамі фальклору ездзіла ў этнаграфічныя экспедыцыі. Цяпер спяваю ў беларускамоўным гурце «Паўночная Сухадроўка».





**Марына з Арцёмам вянчаліся ў самаробных традыцыйных строях. І пра сваіх бацькоў маладыя таксама паклапаціліся.**

— І мужа знайшла сабе такога ж, беларускамоўнага, — дадае Тацццяна Аляксандраўна. — Яны нават вянчаліся ў традыцыйных строях. Свайму мужу дачушка сама вышыла кашулю, сабе ж строй не паспела дарабіць, дык майстрыха ёй дапамагала. І пра сваіх бацькоў дзеці паклапаціліся, дапамаглі нам зладзіць народныя строі, каб мы таксама годна выглядалі на іх вянчанні.

— Мы з Таняй, на жаль, пакуль не размаўляем па-беларуску. Затое дочкі нашы — Марынка і Ірынка — карыстаюцца ёй у штодзённым жыцці. І нас заахвочваюць. Мы ж у іх з задавальненнем вучымся.

***— Як так атрымалася, што ў рускамоўных бацькоў дзве беларускамоўныя дачкі і зяць?***

— Мама з татам хоць і не размаўляюць у штодзённым жыцці па-беларуску, але яны заўсёды шанавалі і шануюць сваё, роднае, — кажа Марына. — Беларускасць жа — гэта не толькі мова. Тата заўсёды цікавіўся гісторыяй Беларусі, у нас дома вялікая бібліятэка. Мы з мужам і сястрой пастаянна стараемся падсунуць яму нейкую беларускамоўную кніжку, бо ведаем, што ён з задавальненнем прачытае. Акрамя таго, мне пашанцавала з настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў гімназіі. Яна чалавек вельмі шчыры, захоплены сваёй справай.

***— Марына, я назірала за вашымі бацькамі, у іх, відаць, вельмі цёплыя адносіны. Такое адчуванне, што сапраўды жывуць душа ў душачку.***

— Праблемы і клопаты — яны ва ўсіх ёсць. Але галоўнае, што вырашаюць у выніку ўсё праз згоду. Бацькі разам ужо больш як 30 гадоў, мы з мужам пакуль толькі тры гады. Але, гледзячы на маму з татам, я зразумела, што галоўнае ў сям'і — доўга не трымаць крыўды. Хутка адыходзіць, хутка прабачаць. І думаць больш пра іншага, як яму будзе лепей.

***— Тацццяна Аляксандраўна, Леанід Рыгоравіч, а вы маеце што дадаць? Мо падзеліцеся з нашымі чытачамі рэцэптам трывалага шлюбу?***

— Рэцэптаў няма ніякіх. Проста муж добры трапіўся *(з усмешкай глядзіць на мужа)*. Саступаць адно аднаму трэба — гэта самае галоўнае. Не гарачыцца. Перад тым як нешта крыўднае выпаліць, палічыце да дваццаці. Супакойцеся і падумайце, што жыццё такое кароткае і не варта траціць яго на сваркі.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*
*Мінск—Віцебск.*

■ Жыццялюбы

# ЯКАЯ Ж ЯНА ДАЧНІЦА?! ТУТЭЙШАЯ, АРЭПІЦКАЯ

**Зірніце, які ўраджай жыта на сваім прысядзібным участку вырасціла дбайная гаспадыня з Арэпічаў. Прычым усё зжала сярпом у свае 84 гады сама! Атрымалася ажно 11 буйных снапоў. Цяпер клопат — абмалаціць іх. У мясцовай гаспадарцы руплівіцы паабяцалі выдзеліць камбайн.**

Домік Вольгі Рыгораўны Кухарчук знаходзіцца непадалёку ад канторы ААТ «Арэпічы». Ён прыкметны: відавочна, пабудаваны даўно, на сваім вяку пабачыў нямала, аднак яшчэ такі моцны, дагледжаны, пафарбаванымі драўлянымі вокнамі паглядае на вуліцу. Да самых веснічак цягнуцца кветкі. Дарэчы, яны ў чысцютка прыбраным і выкашаным двары растуць паўсюль: у цыбулі, на градах з морквай і чырванабокімі памідорамі, у фасолі. Шмат кветак у вазонах на падаконніках.

— А як жа без іх? Не было б так утульна і «цёпла» ў пакоях і на падворку, — кажа Вольга Рыгораўна. — Я імі з дзяцінства захаплялася... Іншая рэч, што раней такога выбару не было — цяпер многа «заморскіх», капрызных кветак. А мне больш даспадобы палявыя, няхай просценькія — ды такія родныя, як у маім дзяцінстве...



Фота Святланы КІСЛАЙ.

Вольга Рыгораўна ўспамінае, як разам з бацькам будавала дом, у якім зараз жыве: «Старэйшы брат слабаваты здароўем быў, а малодшы — дзіця, які з яго памочнік?.. Бацька пушчанскі лес прывёз, сам бярвенне габляваў, рабіў хату сумленна, на доўгія гады. Кухню вялікую запланаваў, каб і нам, дзецям, і гасцям месца хапала. Бывала, са школы прыйду, партфель пад стол кіну і бягу ў лес мох драць. Яго паміж бярвёнамі клалі, каб цёпла зімой было. Хто ж думаў тады, што разам *(кранае рукою шурпатую сцяну дома)* век дажываць будзем?»

З мая па кастрычнік я тут і жыву. А зімою — у Брэсце. Суседзі кажуць пра мяне — дачніца. А якая ж я дачніца? Я ж тутэйшая, арэпіцкая.

У вёсцы работы заўжды многа — у хаце парадак навесці, на двары, грады папалоць. Я да працы звыклая — з пятага класа касіць навучылася, жаць, араць — таму і занятак сабе заўжды знайду. Вось і сёлета жыта пасеяла, каб зелле не расло, бо перад суседзямі сорамна.

Дарэчы, гэтая мілая жанчына 40 гадоў прапрацавала ў Брэсцкім раддоме акушэркай, дапамагала немаўляткам з'явіцца на свет.

— Падумаць толькі — колькі немаўлятак прыняла! — успамінае Вольга Кухарчук. — Неяк спрабавала падлічыць — і збілася. Прыемна было, калі на вуліцы жанчыны мяне пазнавалі, спынялі, «дзякуй» гаварылі, што дапамагла дзіцяці на свет нарадзіцца, хваліліся руҗовашчокімі гарэзамі. А цяпер многія з іх не тое што сваіх дзетак — ужо і ўнукаў маюць. Асабліва шкадавала жанчын з вёскі — старалася такім і пялюшак пабольш прынесці, і словам добрым падтрымаць.

Бывала, просяць мяне проста пабыць побач — заставалася, сядзела да раніцы, нават калі мая змена даўно скончылася. Радавалася разам з парадзіхай, калі немаўлятка нарэшце з'яўлялася на свет, клала яго маме на жывот. Вельмі прыемна было, калі мамачак праз некалькі гадоў зноў бачыла ў радзільнай зале і радасныя бацькі выносілі «канверцік» з чарговым падарункам лёсу.

Не разумела татаў, якія адпраўлялі жонак у раддом з наказам: «Ідзі, нараджай, толькі без сына можаш не вяртацца». А калі Бог даў дачку — то што, у свет ідзі? Даводзілася неадночы з такімі татамі размаўляць, ушчуваць. Так і карцела завесці такога ў радзільную залу, каб пабачыў, адчуў, як «лёгка» дастаецца маці дзіцятка.

Вольга Рыгораўна разумела і шкадавала парадзіх. Тут трэба быць не толькі высакакласным спецыялістам, а яшчэ і псіхолагам, сяброўкай, маці ў рэшце рэшт. Асабліва пачала разумець цяжарных, калі сама нарадзіла сына і дачушку.

— Я цяпер ужо двух унукаў і праўнука маю, — цёпла пасміхаецца, седзячы на лаўцы пад вокнамі сваёй хаты, Вольга Рыгораўна. — Сюды, у вёсачку, ездзяць, ды нячаста — у іх свой, мaлады, пагляд на жыццё. А мне тут добра. Тут мая радзіма, тут мой родны дом.

**Святлана БЯЛЯК.**
*Жабінкаўскі раён*

**ИЗВЕЩЕНИЕ об открытом аукционе по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Кобринском районе Брестской области 28 сентября 2017 года в 11.00**

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Полятичи, ул. Каштановая, 4, Батчинский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380403601000120 | 0,1500 | Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения, водоснабжения | 3000 | 300 | 63,00* |

* расходы на публикацию извещения в СМИ.

**Организатор аукциона – Кобринский районный исполнительный комитет**

**Аукцион состоится 28 сентября 2017 года в 11.00 по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.**
**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу:**
**г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**
**Последний день приема заявлений – 22 сентября 2017 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.**

Продажа земельных участков осуществляется только гражданам Республики Беларусь.
К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

*Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте www.brest-region.by*

**ИЗВЕЩЕНИЕ об открытом повторном аукционе по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Кобринском районе Брестской области 28 сентября 2017 года в 11.30**

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Андроново, ул. Сосновая, 6А, Батчинский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380400101000373 | 0,1259 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 3000 | 300 | 1387,95* |
| 2 | д. Андроново, ул. Дружная, 1, Батчинский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124380400101000386 | 0,1585 | Обеспеченность (возможность) подключения электроснабжения, водоснабжения | 3000 | 300 | 1274,44* |
| 3 | аг. Пески, ул. Полярная, 25, Хидринский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124385507601000387 | 0,1544 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 2000 | 200 | 1208,40* |
| 4 | д. Быстрица, ул. Перамоги, 5, Залесский сельсовет | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 124382500601000424 | 0,1499 | Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения и водоснабжения | 2910,92 | 291,10 | 1217,88** |

* и расходы на публикацию извещения в СМИ
** по лоту №4 возмещаются убытки, связанные с нарушением функционирования мелиоративных сооружений в сумме 879,65 рублей.

**Организатор аукционов – Кобринский районный исполнительный комитет**

**Аукцион состоится 28 сентября 2017 года по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.**
**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу:**
**г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**
**Последний день приема заявлений – 22 сентября 2017 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.**

Продажа земельных участков осуществляется только гражданам Республики Беларусь.
К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

*Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте www.brest-region.by*

**ИЗВЕЩЕНИЕ об открытом аукционе на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Кобрине Брестской области 28 сентября 2017 года в 12.00**

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Срок аренды земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Кобрин, ул. Настасича | Установка и обслуживание торгового павильона (для размещения объектов розничной торговли) | 10 лет | 124350100001007759 | 0,0066 | Сети газоснабжения, водоснабжения, электроснабжения и канализации проходят по улице | 6000 | 600 | 1727,19* |
| 2 | г. Кобрин, ул. Суворова | Строительство и обслуживание блокированных жилых домов типа «Таунхаус» со встроенными помещениями общественного назначениями и общественного здания (для размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) с объектами обслуживания | 50 лет | 124350100001000547 | 1,6132 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения и водоснабжения | 350 000 | 35 000 | 2490,47** |

* и расходы на публикацию извещения в СМИ;
** по лоту №2 возмещаются убытки КУМПП ЖКХ «Кобринское ЖКХ» в сумме 105 756,91 рубля и отделу образования, спорта и туризма Кобринского райисполкома в сумме 117,82 рубля.

**Организатор аукциона – Кобринский районный исполнительный комитет**

**Аукцион состоится 28 сентября 2017 года по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.**
**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу:**
**г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**
**Последний день приема заявлений – 22 сентября 2017 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.**

Продажа права заключения договора аренды земельного участка осуществляется индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам.
К участию в аукционе допускаются индивидуальные предприниматели, юридические лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо), подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

*Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте www.brest-region.by*

**ИЗВЕЩЕНИЕ об открытом повторном аукционе на право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Кобрине Брестской области 28 сентября 2017 года в 12.30**

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Срок аренды земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Кобрин, ул. Мира, 17 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) | 99 лет | 124350100001007115 | 0,1431 | Обеспеченность (возможность) подключения централизованного газоснабжения, электроснабжения, водоснабжения и канализации | 25071,10 | 2507,11 | 857,57* |

* и расходы на публикацию извещения в СМИ

**Организатор аукциона – Кобринский районный исполнительный комитет**
**Аукцион состоится 28 сентября 2017 года по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1-й этаж.**
**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу:**
**г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням**
**Последний день приема заявлений – 22 сентября 2017 г. до 13.00. Тел. для справок: 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.**

Продажа права заключения договора аренды земельного участка осуществляется гражданам Республики Беларусь, иностранным гражданам, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам.
К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо), подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

*Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте www.brest-region.by*

# РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ВЯЛІКІ КУШ»

**Организатор Игры:**
Организатором Игры является Общество с дополнительной ответственностью «Астотрейдинг» (ОДО «Астотрейдинг»), находящееся по адресу: 223053, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Боровая, дом 7, административные помещения; УНП 690362737; E-mail: a-100@a-100.by

**Наименование игры:**
Игра носит название «Вялікі куш».

**Сроки проведения Игры:**
Начало Игры: 04 июля 2017 года.
Окончание Игры: 28 августа 2017 года.
Правила рекламной игры зарегистрированы в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 23 июня 2017 года, свидетельство №3042.
В рекламной игре приняло участие 53 278 участников.
Призовой фонд разыгран полностью.
Обладателями призов:
Денежные средства на приобретение топлива в размере 1122 рублей 33 копеек в сети АЗС ОДО «Астотрейдинг» выиграл 1 человек:

1. А10000000112578 Хорд Алена Игоревна

Денежные средства на приобретение топлива в размере 64 рубля 50 копеек в сети АЗС ОДО «Астотрейдинг» выиграли 50 человек:

1. А10000000029228 Новик Александр Викторович
2. А10000000108855 Чуешова Юлия Александровна
3. А10000000031599 Бабицкий Владимир Петрович
4. А10000000082178 Подмосковная Кристина Валерьевна
5. А10000000109190 Полищук Вадим Юрьевич
6. А10000000065240 Стычук Тимур Романович
7. А10000000093407 Слижевский Валерий Васильевич
8. А10000000109576 Лапчинский Егор Валерьевич
9. А10000000076301 Ерик Дмитрий Иванович
10. А10000000087533 Сотникова Анастасия Сергеевна
11. А10000000068634 Пугачева Светлана Васильевна
12. А10000000014192 Мижуй Илья Дмитриевич
13. А10000000080625 Волощук Дмитрий Николаевич
14. А10000000074242 Егоров Дмитрий Константинович
15. А10000000071684 Васильченко Анатолий Игоревич
16. А10000000057823 Климович Юрий Александрович
17. А10000000024847 Тихомирова Татьяна Вячеславовна
18. А10000000058566 Богдан Светлана Ивановна
19. А10000000054249 Насевич Сергей Валентинович
20. А10000000043122 Башмаков Алексей Николаевич
21. А10000000033461 Романовский Мирослав Олегович
22. А10000000027440 К Дмитрий Михайлович
23. А10000000009358 Коцюба Сергей Валентинович
24. А10000000048600 Щерба Юлия Николаевна
25. А10000000058342 Иванов Андрей Васильевич
26. А10000000019741 Реброва Анна Алексеевна
